Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. ЧАЦВЕР № 203 (29572)

ПРЫКЛАДЫ ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ

Сямейная справа

ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

Сямейная справа

ЛІЧБА ДНЯ

36,3 тыс.

новых кватэр пабудавалі арганізацыі ўсіх формаў уласнасці ў студзені—верасні гэтага года, уведзена ў эксплуатацыю 3,071 млн кв. м жылля, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 1,277 млн кв. м, або 41,6 працэнта ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. З іх з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 950,6 тыс. кв. м. Для шматдзетных сем'яў — 683,8 тыс. кв. м. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 859,5 тыс. кв. м жылля, або 28 працэнтаў ад агульнага ўводу па краіне.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Ахова здароўя павінна быць сферай абсалютна інтэрнацыянальнай»

Кіраўнік дзяржавы працягвае маніторынг медыцынскай сістэмы

Учора Прэзідэнт Беларусі наведаў РНПЦ анкалогіі і Мінскую абласную клінічную бальніцу. Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з прынцыпамі лячэння анкахворых і пацыентаў з COVID-19. У размове з медыкамі ён паабяцаў разгледзець іх запыты аб будаўніцтве новага корпуса абласной бальніцы, жылля для спецыялістаў, а таксама расказаў, калі гатовы зрабіць прышчэпку ад каранавіруса.

Фота Белта.

«СІСТЭМА ВЫБУДАВАНА»

У РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Прэзідэнта сустрэў дырэктар установы Сяргей Палякоў, які расказаў пра асноўныя трэнды ў лячэнні анкалагічных хворых у Беларусі.

СТАР. 2

На рамесніцкім падворку

У Рагачоўскім раёне самабытных, з індывідуальным бачаннем свету і непаўторным стылем выяўлення разьбяроў па дрэве можна палічыць па пальцах адной рукі. Сярод іх — і жыхар вёскі Стрэнькі Ігар ТКАЧОЎ. Займацца дрэвам ён пачаў у дарослым жыцці, пры гэтым пачынаў з простых форм: выразаў звычайныя лыжкі. Далей — болей: дасканала асвоіў геаметрычную тэхніку, а потым пацягнула на больш складаныя — аб'ёмныя выявы. Захапіў свет беларускай фаўны, пачаў ствараць скульптурныя «партрэты» жыхароў нашых лясоў і балот. Цяпер Ігар Рыгоравіч працуе ў Стрэнькаўскім раённым цэнтры рамёстваў, выкладае асновы разьбярства вясковым дзецям (дарэчы, навучыў рамяству і свайго сына), працягвае прыродную тэму, удзельнічае ў фестывалях, выстаўках і кірмашах, а найперш сваімі работамі ўпрыгожвае рамесніцкі падворак.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- **Алімпійскі агонь зімовых Гульняў — 2022 даставілі ў Пекін.**

- У Беларусі пачаў дзейнічаць сумесны з Расіяй цэнтр падрыхтоўкі ВПС і СПА.
- **Вытворчасць ільнянога алею з насення новага ўраджаю пачалі ў Лідскім раёне.**
- Брэсцкая абласная бальніца перапрафілявала сем аддзяленняў для лячэння пацыентаў з COVID-19.
- **Дзень адкрытых дзвярэй у беларускіх аграсядзібах пройдзе 23 кастрычніка.**
- Калядны турнір на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адменены.
- **Кіраўнік «Нафтагаза»: гэтай зімой ва Украіне ўпершыню не будзе дзяржрэгулявання цэн на газ.**

Заробкі ў канвертах

ЗА НАЎМЫСНЫЯ «ШЭРЫЯ» ВЫПЛАТЫ ЦЯПЕР БУДУЦЬ СУДЗІЦЬ

Толькі сёлета органы фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю (КДК) выявілі 30 злачынстваў па выплаце зарплаты ў канвертах

Як вядома, праблема «ценявой» эканомікі ў нашай краіне знаходзіцца на асаблівым кантролі органаў фінансавых расследаванняў. І як аказалася, магутны рычаг у барацьбе з махінацыямі — узмацненне жорсткасці заканадаўства. Калі раней за выплату «шэрай» зарплаты, ухіленне ад падаткаў і страхавых узносаў толькі штрафавалі, то цяпер прадугледжаная крымінальная адказнасць. Створана і міжведамасная рабочая група. Яе задача — вызначыць дакладны алгарытм дзеянняў дзяржорганаў пры выяўленні падобных злачынстваў і выключыць дубліраванне іх функцый.

Свядомыя «ўхілісты» адкажуць

Адным з аспектаў ценявой эканомікі з'яўляюцца зарплаты ў канвертах. Як расказаў **намеснік дырэктара Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Андрэй ПРАКАПУК,** нелегальна заработную плату выплачваюць рознымі спосабамі, пачынаючы ад няўлічанай выручкі і незаконных фінансавых аперацый, заканчваючы наяўнасцю работнікаў, якія проста лічацца на прадпрыемстве, але грошы за іх працу атрымліваюць іншыя.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

«Ахова здароўя павінна быць сферай абсалютна інтэрнацыянальнай»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Медык паведаміў, што апошнім часам назіраецца зніжэнне выяўлення анкалагічных захворванняў падчас скрынінгу. Урач адзначае, што, на жаль, прычына гэтага — не змяншэнне захваральнасці, а зніжэнне выяўляльнасці анкалогіі. «Гэтая тэндэнцыя існуе ва ўсім свеце з-за эпідэмічнай сітуацыі. Гэта не нешта асаблівае. Увогуле, мы на сярэднееўрапейскім узроўні па выяўляльнасці захворванняў у нашых пацыентаў», — сказаў Сяргей Палякоў. Пры гэтым, па яго словах, людзі сталі звяртаць больш увагі на сваё здароўе і часцей прыходзіць з праблемамі да спецыялістаў. Колькасць анкахворых, што стаяць на ўліку ў краіне, складае па леташніх выніках амаль 325 тысяч.

Важным паказчыкам, на падставе якога медыкі ўскосна мяркуюць аб сітуацыі з запушчанымі формамі анкалогіі, з'яўляецца аднагадовая лятальнасць. Колькасць пацыентаў, што выжылі на працягу года пасля выяўлення раку і потым памерлі, знізілася ў два разы. «І мы ўтрымліваем пакуль гэту лічбу, нягледзячы на ковідную сітуацыю і тое, што людзі звярталіся менш. Гэты паказчык не расце, а летась нават знізіўся на 19 працэнтаў», — паведамляе Сяргей Палякоў.

Лячэнне анкалогіі ў нашай краіне, паводле слоў урача, трымаецца на трох кітах — хірургіі, радыялогіі (апрамяненні) і хіміятэрапіі. Хірургія найбольш яскрава паказвае магчымасці беларускіх спецыялістаў-анколагаў. Кожны дзень у цэнтры праводзяцца каля 70 аперацый, і нягледзячы на ковідную сітуацыю, іх колькасць нарошчваецца. У аперыраванні злаякасных пухлін усё больш актыўна выкарыстоўваюцца лапараскапічныя тэхналогіі, што дазваляе рабіць малаінвазійныя ўмяшальніцтвы з высокай эфектыўнасцю.

Прэзідэнт спытаў, ці магчыма на працягу аднаго-двух пакаленняў стварыць таблетку ці вакцыну ад раку?

«Для некаторых формаў пухлін такое ёсць і будзе. Калі мы пранікнем углыб клеткі раку, зразумеем генетыку гэтай пухліны, тады зможам на генетычным узроўні мяняць задачу, што ставіць злаякасная клетка. Такія прэпараты ёсць, але яны больш выкарыстоўваюцца для пацыентаў, у якіх ужо метастатычны працэс. Цяпер у многіх пацыентаў з пухлінамі нырак, метастазамі назіраецца выжыванне 5-7 гадоў, і на гэтых прэпаратах яны жывуць яшчэ доўга. Але адной таблеткі для ўсіх формаў раку, на жаль, верагодна, ніколі не будзе», — выказаў меркаванне Сяргей Палякоў. Памочнік Прэзідэнта Аляксандр Косінец не пагадзіўся, заўважыўшы, што такія распрацоўкі ў свеце ўжо вядуцца.

Дырэктар РНПЦ расказаў пра экспарт паслуг у цэнтры. Іх прыцягальнасць заснаваная на прафесіяналізме ўрачоў, абсталяванасці медустановы, якасці догляду і даверу. «Пацыентам з некаторых краін выгадней тут лячыцца за грошы, чым «бясплатна» ў сябе, — дадаў Сяргей Палякоў. — Але грошы прыходзяць не толькі ад пацыентаў, што лечацца. Вялікі зрэз — грошы ад клінічных выпрабаванняў. Гэта прыносіць і дзяржаве фінансы, і новыя прэпараты нашым пацыентам, і дастойныя заробкі ўрачам».

У лячэнні анкалогіі ў Беларусі выбудавана сістэма. На першым узроўні — РНПЦ для дарослых і для дзяцей, на другім — Мінскі цэнтр і дыспансеры ў кожнай вобласці (у Гродне будуецца), на трэцім — міжраённыя дыспансеры і некалькі аддзяленняў для хіміятэрапіі.

«Сістэма выбудавана. Для мяне гэта важна, бо 20 гадоў таму і больш мы толькі пачыналі яе выбудоўваць. Мы гэта зрабілі, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Значыць, нічога не трэба ламаць і перамен не трэба на сёння ў анкалагічнай службе, за выключэннем удасканалення прафесіяналізму», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы, дадаўшы, што заўсёды лічыў айчынных урачоў не горшымі за іншых, нават лепшымі.

Прэзідэнт чарговы раз звярнуўся да тэмы вакцынацыі ад ковіду, адзначыўшы: у свеце ідзе бойка за цэны і рынкі.

«Я ***лічу, што ахова здароўя павінна быць сферай абсалютна інтэрнацыянальнай.*** На здароўі, жыцці людзей нельга (нажывацца. — **«Зв.»**)», — сцвярджае Аляксандр Лукашэнка.

Ён мяркуе, што ў багатых заходніх краінах назіраецца высокая смяротнасць ад ковіду з-за разбуранай сістэмы аховы здароўя. «За кошт арганізаванасці, цэнтралізацыі, вертыкалі ўзаемадапамогі, што ў нас выбудавана, выйгралі», — дадаў кіраўнік краіны, заўважыўшы, што не ў шмат якіх краінах свету магчыма за некалькі гадзін шпіталізаваць пацыента з сельскай мясцовасці ў рэспубліканскі цэнтр. ***«Гэта магчыма толькі, як у нас называюць, «саўковай», «сацыялістычнай» Беларусі. Хай называюць, як хочуць. Калі чалавеку жыць хочацца, яму ўсё роўна — капіталізм ці сацыялізм»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, сёння асабліва важна развіваць не толькі працэс лячэння анкахворых, а стварацьу РНПЦ перадавыя напрацоўкі: «Нешта неабходна стварыць такое, што застанецца на стагоддзі ў гісторыі чалавецтва. І вы да гэтага гатовыя. Магчыма, неабходна падумаць. Магчыма, вакцыну нейкую. У нас жа задзел ёсць. Мы павінны падумаць, што мы можам зрабіць, каб і сваіх людзей ратаваць, і каб у свеце сказалі: «Малайцы беларусы!»

Пасля Аляксандр Лукашэнка прайшоўся па палатах бальніцы, пагутарыў з пацыентамі.

ЗНОЎ У «ЧЫРВОНАЙ ЗОНЕ»

Затым Прэзідэнт перамясціўся ў размешчаную побач з РНПЦ Мінскую абласную клінічную бальніцу, дзе азнаёміўся з лячэннем ковід-хворых. Па даных на 19 кастрычніка, там знаходзілася больш за 200 пацыентаў, з іх два дзясяткі — у цяжкім стане, 11 — на ШВЛ. Усяго абласная бальніца можа прыняць 220 ковід-хворых.

Стацыянарнае лячэнне ва ўстановах аховы здароўя Міншчыны атрымлівае больш за 4100 чалавек, з іх 3800 — ковід-хворыя. Штучную вентыляцыю лёгкіх праводзяць 113 пацыентам, большасць з іх мае пацверджаны ковідны дыягназ. Усяго для пацыентаў з каранавірусная інфекцыяй у вобласці функцыянуюць 4387 ложкаў (занятыя 94,5 %) і 206 апаратаў ШВЛ (занятыя 53 %).

Кіраўніку краіны далажылі аб наяўнасці неабходнага абсталявання, лекаў і кіслароду. Дапамогу ў абласной бальніцы хворым на каранавірус аказваюць у пяці інфекцыйных аддзяленнях і яшчэ ў некалькіх перапрафіляваных. Лабараторыя медустановы ў даковідныя часы выконвала каля 160-200 даследаванняў у змену, цяпер мае магутнасць 2000-2100 даследаванняў ПЛР. Бальніца змяшчае 332 ліжкародныя пункты, толькі палова з іх задзейнічана ў лячэнні ковіду. У рэзерве ёсць і ШВЛ-, і наркозна-дыхальныя апараты.

Прэзідэнт зноў наведаў «чырвоную зону». З пачатку пандэміі ён некалькі разоў быў у аддзяленнях, дзе ўтрымліваюць інфіцыраваных хворых. Беларускі лідар паразмаўляў там з медыкамі, якія лечаць пацыентаў і ў рэанімацыі.

«МЫ ПРАРВЁМСЯ»

Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні медыцынскага персаналу Мінскай абласной клінічнай бальніцы. Прэзідэнт адзначыў, што, па яго інфармацыі, гэтым часам ковід «прыціснуў» грып — людзі фактычна не хварэюць на грып. Ён спадзяецца, што такі ж эфект будзе і з анкалогіяй, бо каранавірус лячыць прасцей, чым пухліны.

Па словах кіраўніка краіны, вынікам нарады ў аўторак на тэму пандэміі сталі аптымістычныя прагнозы.

«Мы адчуваем нейкі аптымізм — 3-4 працэнты зніжэння. Зрэшты, ёсць і рост, але не такі моцны, як два тыдні таму. Магчыма, вам па бальніцы відаць, і па краіне мы гэта адчуваем. Ёсць асцярожны аптымізм, што мы прарвёмся, але хацелася б хутчэй», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падзякаваў медыкам за іх складаную работу і папрасіў ні ў якім выпадку не скарачаць планавую дапамогу і кансультацыі.

«Калі чалавека не прымаюць у паліклініцы ці бальніцы, ён пачынае хвалявацца і турбавацца, таму ваша сустрэча з хворым чалавекам — гэта ўжо яго выздараўленне», — дадаў кіраўнік краіны.

Супрацоўнікі бальніцы паскардзіліся Прэзідэнту на нявырашанае за дзесяцігоддзе пытанне з будаўніцтвам новага корпуса. Кіраўнік краіны праект падтрымаў, але заўважыў: «Я галоўнаму ўрачу і міністру казаў: павінна быць усё аптымальна і функцыянальна. На чым нельга эканоміць — на медыцынскім абсталяванні. Бачу ў вас празмернасці ў гэтым праекце».

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што хопіць узводзіць новыя школы і бальніцы: лепш гэтыя грошы накіраваць на зарплаты настаўнікам і медыцынскім работнікам. «Гэта не таму што мы спынім фінансаванне высокатэхналагічнага абсталявання і не будзем будаваць. Але трэба падкараціць, а калі і будаваць, то вельмі-вельмі аптымальна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў: праект новага корпуса абласной бальніцы, хутчэй за ўсё, будзе падтрыманы, а фінансавую дапамогу дасць Кітай. «Але адразу глядзіце, дзе што падрэзаць: лішніх грошай няма. І нават калі яны ёсць, іх трэба траціць на медыцынскае абсталяванне, лекі, навуку, укладваць у таленавітых урачоў, а не проста будаваць сцены», — заявіў кіраўнік краіны.

Наступнае пытанне ад медыкаў — пра жыллё. У пасёлку, дзе размешчана бальніца, ёсць свабодны ўчастак. Медыкі папрасілі кіраўніка дзяржавы садзейнічаць у перапрафіляванні гэтага ўчастка пад будаўніцтва жылля. Прэзідэнт прапанаваў яшчэ некалькі варыянтаў вырашэння кватэрнага пытання: «Я ж па суседстве жыву. Па-першае, вакол мяне ёсць яшчэ некалькі ўчасткаў. Адзін вы занялі. Трэба паглядзець і іншыя. Там і да 7 га ёсць. Гэта ў лесе, курортная, можна сказаць, зона. Таму трэба паглядзець тыя ўчасткі». Другі варыянт — выдзеліць зямлю непасрэдна каля Бараўлян. Увогуле Прэзідэнт заявіў, што неабходна на працягу гэтага і першай паловы будучага гадоў прыняць рашэнне па Бараўлянах: вылучыць пасёлак з Мінскага раёна, зрабіць горадам.

Пахваліліся ўрачы, што большасць з іх ужо прышчапілася супраць ковіду, чакаюць рэвакцынацыі і запыталі ў Прэзідэнта: ці ёсць прышчэпка ў яго планах?

Кіраўнік дзяржавы параўнаў: Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін вакцынаваўся «Спадарожнікам V», Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн — вакцынай Pfizer, таму і ён гатовы гэта зрабіць, але таксама толькі айчыннымі прэпаратам.

«Мы дамовіліся з Дзмітрыем Леанідавічам Піневічам (міністр аховы здароўя. — **«Зв.»**): як толькі беларуская вакцына на стале, мы адразу з ім і налева, і направа, і ў нагу — куды заўгодна ўколемся. Так што давайце вакцыну — я гатовы, але нашу, сваю беларускую вакцыну. Гэта шчыра», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА,
Мінскі раён.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Марк Цукерберг мае намер змяніць назву Facebook

Кампанія Facebook можа ў найбліжэйшы час правесці поўны рэбрэндынг усёй сацыяльнай сеткі, аж да назвы. Аб гэтым піша выданне The Verge.

У Facebook пакуль не раскрываюць новую назву платформы, аднак прадстаўнік кампаніі даў наводку. Ён адзначыў, што Facebook плануе змяніць назву на наступным тыдні, каб яна адлюстроўвала яе скіраванасць на пабудову «метасусвету».

Многія ўпэўненыя, што новая назва Facebook можа быць звязана з VR-дадаткам Horizon, над якім каманда Марка Цукерберга працавала некалькі гадоў. Як мяркуецца, стваральнік сацсеткі асабіста заявіць пра перамены ўжо 28 кастрычніка, аднак розныя спецыялісты не перажываюць, бо рэбрэндынг у падобнай індустрыі — справа звычайная.

У Вярхоўнай Радзе паведамілі пра двухгадзінныя чэргі з катафалкаў у крэматорый

Чарга з катафалкаў з-за росту заражэння каранавірусам у кіеўскі крэматорый сёння складае каля дзвюх гадзін, паведаміў у сераду дэпутат Вярхоўнай рады ад прапрэзідэнцкай фракцыі «Слуга народа», старшыня парламенцкага камітэта па пытаннях аховы здароўя Міхаіл Радуцкі. Паводле яго слоў, ва Украіне за мінулыя суткі зафіксавалі больш за 18 тысяч хворых на каранавірус.

Ён таксама паведаміў аб падтрымцы паўторнай арганізацыі вакцынацыі ў сценах парламента для дэпутатаў і супрацоўнікаў заканадаўчага органа.

Раней кабінет міністраў Украіны падоўжыў «адаптыўны» каранцін з-за каранавіруса да 31 снежня. Гэтая мадэль каранціну прадугледжвае абмежаванні ў асобных рэгіёнах. Уведзены чатыры зоны эпідэмічнай небяспекі: «зялёная», «жоўтая», «аранжавая» і «чырвоная».

Названы шэсць галоўных прычын звальнення расіян

Жыхароў Расіі часцей за ўсё звальняюць за які-небудзь амаральны ўчынак або канфлікт на рабочым месцы. Пра гэта піша РБК са спасылкай на сумеснае апытанне «Работа.ру» і «СберСтрахование».

Па выніках даследавання, у якім удзельнічала больш за тысячу прадстаўнікоў кампаній з усіх расійскіх рэгіёнаў, крыху менш за палову рэспандэнтаў (45 працэнтаў) лічаць праступак галоўнай прычынай звальнення. Трыццаць шэсць працэнтаў кіраўнікоў могуць расстацца з супрацоўнікам з-за яго дрэнных адносін з калегамі. Каля трэці апытаных (32 працэнты) адзначылі, што гатовыя скасаваць дамову з-за частых спазненняў і хвароб.

За недастатковую засяроджанасць і недаступнасць у рабочы час гатовыя звольніць 29 і 27 працэнтаў расіян адпаведна. Яшчэ шэсць працэнтаў у якасці прычыны назвалі адмову работніка працаваць звышурочна.

САНКЦЫІ І ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ

Нягледзячы ні на што, мы сталі яшчэ мацнейшымі

Такую думку выказаў памочнік Прэзідэнта, доктар эканамічных навук Валерый БЕЛЬСКІ на прэзентацыі навінкі лесанарыхтоўчай тэхнікі — айчыннай мадэлі «Амкадор» FF1461. Знаёмцеся — гэта сучасны форвардэр з колавай формулай 6х6 (метраў), укамплектаваны выпрабаваным узорам маніпулятара, універсальны лесавозны паўпрычэп грузападымальнасцю 10 тон.

Фота БелТА.

Па словах Валерыя Бельскага, сталічны завод «Амкадор» практычна пачынаў з нуля, а сёння гэтае прадпрыемства канкурыруе як роўны з вядучымі вытворцамі спецыяльнай грузавой тэхнікі і нават адсоўвае іх з гэтага рынку. Нягледзячы на санкцыі, якія ўжылі да нашай краіны, калектыў прадпрыемства згуртаваўся, і за зусім кароткі час удалося замясціць імпартную прадукцыю ўласнай вытворчасцю.

У сваю чаргу, **намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр СУБОЦІН** адзначыў, што гэтаму прадпрыемству пасля ўвядзення санкцый з боку Еўрасаюза прыйшлося сур'ёзна перагледзець бізнес-мадэлі і змяніць схемы закупак камплектуючых і далейшых продажаў. Але відавочна, што людзі на заводзе справіліся з гэтай задачай. «У выніку «Амкадор» пачаў рабіць тэхніку не горшую за тую, якую мы закуплялі. Частку агрэгатаў і запчастак да іх прыйшлося асвоіць уласнымі сіламі, нешта мы заказалі ў сваіх сяброў. Мы бачым, што цяпер на прадпрыемстве назіраецца цесны сплаў сучаснай навукі са строгай вытворчасцю. Калі адно ў іншае аператыўна перацякае — тады і атрымліваецца добры вынік, — удакладніў намеснік прэм'ер-міністра. — Мы заўсёды хацелі вырабляць больш сваёй прадукцыі, пярыць яе на міжнародных рынках. Дадзены бар'ер лішні раз паспрыяў самаразвіццю нашай прамысловасці. У апошні час замежнагандлёвае сальда перавысіла 2 млрд долараў. Гэта таксама доказ таго, што мы трошкі па-іншаму сталі паводзіць сябе, па-іншаму прадаваць — дзесьці больш агрэсіўна, больш разумна. У цэлым мы памяняліся і сталі лепшымі».

Старшыня Савета дырэктараў холдынга Аляксандр ШАКУЦІН расказаў, што прадпрыемства сапраўды трапіла пад санкцыі. Таму «Амкадор» сёння не можа пастаўляць сваю прадукцыю краінам Еўрасаюза. «Дарэчы, да гэтага паміж нашымі краінамі (прадпрыемствамі) хутка і бурна развіваліся таварныя адносіны, калі пастаўкі ў Еўрасаюз планаваліся на ўзроўні да 400 машын у год. Асабліва гэта датычылася лясных машын, дзе ў нас намеціўся тэхналагічны прарыў», — сказаў Аляксандр Шакуцін.

Але цяпер холдынг быў вымушаны дыверсіфікаваць рынкі збыту, шукаць новых партнёраў і новыя краіны. Не так даўно многія далёкія краіны расчынілі свае дзверы для нашай прадукцыі. Гэта датычыцца афрыканскіх краін, якія літаральна сёння зрабілі заказ на нашу тэхніку ў аб'ёме каля 12 млн долараў. Гэта і азіяцкія краіны, але найбольш цёпла нас прымаюць нашы найбліжэйшыя суседзі — у Расіі. У Расійскай Федэрацыі, асабліва ў рэгіёнах, беларускую тэхніку прыраўнавалі да тавараў расійскай вытворчасці», — расказаў кіраўнік «Амкадора».

Ён заўважыў, што санкцыі прымусілі калектыў згуртавацца, а эліта завода паказала свой характар і ўменне выходзіць са складаных сітуацый. Сёння на заводзе вядзецца маштабная работа па стварэнні імпартазамяшчальных машын, вузлоў і агрэгатаў. Створаны машыны, у якіх уваходзіць больш за 70 % элементнай базы ўласнай вытворчасці. Толькі за перыяд са снежня 2020 года да верасня гэтага года ў холдынгу распрацавана і пастаўлена ў вытворчасць сотні найменняў камплектуючых машын вытворчасці «Амкадор».

Сёння холдынг плануе да канца года павялічыць аб'ём вытворчасці ў 1,8 раза. «Мы ідзём з тэмпамі росту 170 %. У першым паўгоддзі ў нас былі некаторыя праблемы з пастаўкай камплектуючых для лясных машын, што стрымлівала выпуск тэхнікі. Цяпер многія камплектуючыя асвоілі самі, паставілі ў вытворчасць. Плюс мы знайшлі новых партнёраў, якія пачалі іх для нас вырабляць. Думаю, з улікам усіх нашых магчымасцяў мы павялічым аб'ём вытворчасці і год скончым з тэмпамі росту больш як 180 %, — сказаў Аляксандр Шакуцін. — Усё, што вырабляем, — мы прадаём, а па асобныя машыны, такія як лясныя, стаіць чарга, унесена перадаплата на некалькі месяцаў наперад».

Сяргей КУРКАЧ.

СЛОВЫ І СПРАВЫ

Як забароны стымулявалі беларускі экспарт

Ёсць словы пра санкцыі ў дачыненні да беларускіх вытворцаў, а ёсць канкрэтныя факты, якія адлюстроўваюць рэальнае развіццё сітуацыі. З лічбамі не паспрачаешся. Напрыклад, сёлета ў студзені—верасні Літва імпартавала беларускіх тавараў прыкладна на 800 мільёнаў еўра, гэта значыць на 50 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Адпаведныя даныя апублікаваў Дэпартамент статыстыкі краіны, паведаміў аналітычны партал RuBaltic.Ru.

На праблему беларускага імпарту ў Літве звярнулі ўвагу грамадскія актывісты. Яны выявілі: кожны дзясяты літр піва на паліцах іх крам вырабляе беларускае прадпрыемства «Крыніца». Па папярэдніх звестках, штогод у Літве прадаюць каля 20 мільёнаў літраў беларускага піва, гэта амаль 10 працэнтаў усяго ўнутранага рынку. Аднак піва — зусім не галоўны тавар, які Літва закупляе ў Беларусі. У артыкуле, апублікаваным Дэпартаментам статыстыкі Літвы два месяцы таму, гаворыцца, што па выніках першых шасці месяцаў гэтага года імпарт з Беларусі падскочыў на 58,3 % і склаў амаль 560 мільёнаў еўра. Нягледзячы на санкцыі, сцвярджае Дэпартамент статыстыкі Літвы, паток тавараў з гэтай краіны не толькі не запаволіўся, але і стаў рэкордным: кампаніі кінуліся купляць беларускія тавары да таго, як іх пастаўкі былі парушаныя.

Эканаміст банка SEB Тадас Павілускас звяртае ўвагу на тое, што з-за пандэміі каранавіруса летась гандаль паміж краінамі падаў. Гэта значыць, збольшага Беларусь у Літве проста адыгрывае свае экспартныя страты. За студзень—верасень 2019 года яна адправіла ў Літву прадукцыі на 812,9 мільёна еўра. Сёлета — амаль столькі ж, і ніякія санкцыі ЗША і ЕС гэтаму не перашкодзілі. Каментуючы вынікі першага паўгоддзя, Тадас Павілускас прыйшоў да высновы: па выніках наступных шасці месяцаў сітуацыя будзе выглядаць значна горш. Але яго прагнозы не спраўджваюцца. У ліпені і жніўні Літва працягвала ўдарнымі тэмпамі закупляць беларускую прадукцыю.

Пры гэтым RuBaltic.Ru адзначае, што самы вялікі прыбытак у гандлі з Літвой Беларусі прынесла электраэнергія. Тая самая, ад якой Літва павінна была засцерагчыся пасля запуску БелАЭС. «Прэзідэнт Гітанас Наўседа, прэм'ер-міністр Інгрыда Шыманітэ, кіраўнік МЗС Габрыэлюс Ландсбергіс і іншыя прадстаўнікі літоўскага істэблішменту ўгаворваюць сваіх замежных таварышаў далучыцца да байкоту астравецкага «атамнага монстра». Тым часам высвятляецца, што ў студзені—жніўні гэтага года Літва заплаціла за беларускую электрычнасць 132,6 млн еўра. Прыкладна на 46 млн еўра больш, чым за ўвесь 2020 год», піша RuBaltic.Ru. Дэпартамент статыстыкі Літвы раскрыў сакрэт Полішынэля: патрабуючы ад іншых спыніць імпарт электраэнергіі з Беларусі, сама краіна гэтага не робіць. Пастаўкі не проста працягваюцца — яны растуць у параўнанні з перыядам, калі БелАЭС яшчэ не працавала.

«На розум прыходзяць словы вядомай песні з савецкага кінафільма: «Что они не делают, не идут дела». Лабіравалі санкцыі супраць Беларусі — нарасцілі імпарт беларускай прадукцыі. Абвясцілі байкот БелАЭС — павялічылі імпарт беларускай электрычнасці. Калі б палітыкам уручалі прэміі за самыя недарэчныя «дасягненні», прадстаўнікі Літвы дакладна прэтэндавалі б на Гран-пры», — перакананы RuBaltic.Ru.

Здаецца, што ўрад Літвы значна больш дбае пра свой імідж у вачах партнёраў па ЕС і НАТА, чым пра сваё насельніцтва. Сварачыся з суседнімі дзяржавамі, Літва наносіць страты сваёй жа эканоміцы. Такая контрпрадукцыйнасць відавочная для ўсіх, акрамя літоўскіх улад, адзначыла The Baltic Word. Мяркуючы па дзеяннях улад, у Вільнюса мала інструментаў для дасягнення сваіх палітычных мэт. Таму кіраўніцтва Літвы вырашыла дамагчыся жаданых вынікаў, запатрабаваўшы ад краін — членаў ЕС і НАТА розных санкцый. «Закліканочы да санкцый і дэманструючы «непахісную палітычную волю», Літва агаліла «дабрабыт» уласнага насельніцтва», — адзначае The Baltic Word.

Так, цэны на цэнтралізаванае ацяпленне ў краіне сёлета вырастуць у сярэднім прыкладна на 30 працэнтаў. Цэны на біяпаліва, за кошт якога ў Літве вырабляюць 70 % цеплаэнергіі, цяпер прыкладна на 40 % вышэй, чым летась. «Такі велізарны скачок цэн у такі напружаны час можа пагражаць сацыяльным крызісам і ростам напружанасці ў грамадстве», — заўважыў Лукас Тамулінас, старшыня руху LSDP Momentum Vilnius.

Варта адзначыць, што, па звестках Дэпартамента статыстыкі Літвы, цэны на спажывецкія тавары і паслугі ў краіне растуць восьмы месяц запар. Раней стала вядома, што летась кожны пяты жыхар Літвы знаходзіўся за мяжой беднасці. Пры гэтым пенсіянеры лічацца адной з самых уразлівых груп у краіне. У 2019 годзе Літва ўвайшла ў пяцёрку вядучых антылідараў ЕС па ўзроўні рызыкі беднасці для пенсіянераў. Доля людзей, старэйшых за 65 гадоў, схільных да рызыкі беднасці, склала 18,7 %. «У такой сітуацыі санкцыі, уведзеныя ў дачыненні да суседніх краін, якія цесна звязаныя з літоўскай эканомікай і непасрэдна ўплываюць на дабрабыт жыхароў Літвы, прынамсі, наносяць шкоду», — рэзюмуе The Baltic Word.

Далей — болей. Бельгія (у сталіцы якой, нагадаю, знаходзяцца штаб-кватэра Еўрасаюза і офіс НАТА) спрабуе аслабіць санкцыі Еўрасаюза ў дачыненні да калійнай прамысловасці Беларусі, паколькі гэтыя абмежаванні ствараюць цяжкасці для еўрапейскіх кампаній, паведаміў Bloomberg са спасылкай на ліст бельгійскіх дыпламатаў. Дыпламаты звярнуліся да іншых краін — членаў ЕС з просьбай паслабіць абмежаванні ў дачыненні да беларускага калію. У лісце дыпламаты кажуць, што санкцыі, уведзеныя ў дачыненні да вытворцы калійных угнаенняў «Беларуськалія», выклікалі праблемы ў еўрапейскіх кампаній. На іх думку, на калійны сектар не варта распаўсюджваць санкцыі. У лісце адзначаецца, што калі еўрапейскія кампаніі будуць вымушаныя закупляць калійныя ўгнаенні ў іншых краінах, гэта прывядзе да скачка цэн і зніжэння якасці адпаведнай прадукцыі.

Яшчэ адзін дакумент, з якім азнаёміўся Bloomberg, сведчыць, што пазіцыю бельгійскіх дыпламатаў падзяляюць і іншыя краіны. Таксама адзначаецца, што на гэтым тыдні адбудзецца сустрэча дыпламатаў ЕС, падчас якой дадзенае пытанне можа быць разгледжана. У гэтым годзе цэны на ўгнаенні рэзка ўзраслі. Больш высокія затраты на пажыўныя рэчывы таксама рызыкуюць пагоршыць глабальную інфляцыю прадуктаў харчавання ў той час, калі ў свеце расце колькасць людзей, якія галадаюць, асабліва ў больш бедных краінах.

Тым часам беларускія вытворцы актыўна адстойваюць сваю пазіцыю. Днямі стала вядома, што «МАЗ», «БелАЗ» і «Белаэранавігацыя» падалі іскі аб адмене рашэнняў Савета Еўрасаюза, які налажыў індывідуальныя санкцыі на гэтыя прадпрыемствы. Адпаведная інфармацыя была апублікавана ў афіцыйным часопісе ЕС. Так, «МАЗ» і «БелАЗ» аспрэчваюць рашэнне Савета ЕС ад 21 чэрвеня аб абмежавальных мерах. У якасці аргумента абедзве кампаніі адзначаюць некарэктнае прывядзенне свайго афіцыйнага наймення ў дакументах ЕС. Яны ўказваюць на няслушныя і неабгрунтаваныя падставы для прызначэння абмежаванняў. Гэта сцвярджае ў сваім іску і дзяржпрадпрыемства «Белаэранавігацыя», якое адзначае, што санкцыі рызыкуюць паставіць пад пагрозу забеспячэнне бяспекі палётаў у міжнароднай авіяцыі.

Зрэшты, інвестыцыйны інтарэс да нашай краіны зусім не змяншаецца. «Заходнія краіны, якія ўвялі пэўныя санкцыі ў дачыненні да Беларусі, — гэта менш за 30 працэнтаў сусветнай эканомікі. Сёння мы бачым крыніцы інвестыцый, мы бачым цікавасць да Рэспублікі Беларусь у вялікай колькасці інвестараў па ўсім свеце, — адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй Савіных. — Гэта Паўднёва-Усходняя Азія, Блізкі Усход і краіны Лацінскай Амерыкі. Я перакананы, што пры належнай арганізацыі работы мы заўсёды здолеем прадставіць свае праекты і зацікавіць у іх замежных інвестараў». Час усё расставіць па сваіх месцах.

Пётр ДУНЬКО.

ЗА НАЎМЫСНЫЯ «ШЭРЫЯ» ВЫПЛАТЫ ЦЯПЕР БУДУЦЬ СУДЗІЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У заработнай плаце «ў канверце» нярэдка зацікаўлены і наймальнікі, і работнікі. Апошнія атрымліваюць больш высокі даход — за кошт неаплічэнняў у адпаведныя фонды і бюджэт. Разам з тым, атрымліваючы імгненную выгаду, супрацоўнікі не ўсведамляюць, што ў будучыні будуць мець больш нізкі памер пенсіі, недастатковую разліковую плацежаздольнасць пры звароце ў банк па атрыманне крэдыту, а таксама адсутнасць сацыяльных гарантый, звязаных з часовай непрацаздольнасцю.

— Мы арыентаваны на выяўленне нелегальнай выплаты зарплаты. Сёлета органы фінансавых расследаванняў КДК выявілі 30 злачынстваў па выплаце зарплаты «ў канверце», па іх распачаты крымінальныя справы. Устаноўлены факты такіх выплат больш чым 800 работнікам. Сума шкоды ад нявыплаты ў бюджэт падаходнага падатку і абавязковых страхавых узносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) налічвае звыш 7,2 млн рублёў, — адзначыў Андрэй Пракапук.

Паводле яго слоў, выпрацаваны дакладныя крокі для эфектыўнага выяўлення парушэнняў па нелегальнай выплаце заработнай платы. Вызначаны крытэрыі, па якіх праводзіцца адбор суб'ектаў гаспадарання для іх падрабязнага вывучэння. Праверцы падлягаюць таксама арганізацыі і прадпрыемствы, якія праходзілі па іншых эканамічных злачынствах. Раней за выплату заработнай платы «ў канверце» наймальнік мог быць прыцягнуты толькі да адміністрацыйнай адказнасці, але многія плацельшчыкі ўзносаў у ФСАН нават пасля штрафаў працягвалі парушаць заканадаўства. Для абароны работнікаў і дзяржавы адказнасць зрабілі больш жорсткай — цяпер за наўмысныя дзеянні па ўхіленні ад выплаты абавязковых страхавых узносаў і абавязкаў па пералічэнні падаходнага падатку прадугледжваецца крымінальная адказнасць.

Прадстаўнік Дэпартамента фінансавых расследаванняў асобна падкрэсліў, што крымінальную адказнасць прадугледжана не для ўсіх парушальнікаў — на асаблівым кантролі тыя, хто робіць гэта свядома і неаднаразова.

Павышаецца ўзровень узаемадзеяння паміж праваахоўнымі і кантралюючымі органамі. Цяпер распрацоўваецца пагадненне аб парадку ўзаемадзеяння паміж органамі Камітэта дзяржкантролю, падатковымі органамі і органамі ўнутраных спраў, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны насельніцтва. Асноўная іх мэта — вызначыць эфектыўны механізм узаемадзеяння для спынення парушэнняў па нелегальнай выплаце заработнай платы.

Як выйсці з заганнага кола?

Аказваецца, выйсце ёсць. І яго не мы прыдумалі. Вынікі прынесла анлайн-пляцоўка зваротнай сувязі «Скажы «не» заробку «ў канвертах» на сайце Камітэта дзяржкантролю. Цяпер свядомыя работнікі могуць ананімна расказаць аб парушэннях. Толькі за некалькі месяцаў паступіла некалькі сотняў паведамленняў. У большасці выпадкаў агучаныя факты пацвердзіліся.

— Праверцы інфармацыі, якая паступае на анлайн-панэлі зваротнай сувязі кантрольнага ведамства, аддаюць асаблівую ўвагу. Менавіта туды грамадзяне могуць канфідэнцыйна паведаміць інфармацыю пра факты парушэння, пасля чаго яна аналізуецца, сістэматызуецца і выкарыстоўваецца пры планаванні праверачных мерапрыемстваў. Так, з мая да верасня бягучага года з дапамогай дадзенай платформы было прынята 201 паведамленне ад насельніцтва аб фактах выплаты заработнай платы «ў канверце», — распавёў Андрэй Пракапук.

Паводле яго слоў, 161 паведамленне аб выплаце заработнай платы ў канверце датычылася суб'ектаў гаспадарання Мінска і Мінскай вобласці. Гэта 80 % з усіх зваротаў, якія паступілі на анлайн-платформу. Органы фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю праверылі 80 паведамленняў, па 121 праверачная мерапрыемствы працягваюцца. У шэрагу выпадкаў інфармацыя знайшла пацвярджэнне.

Пакуль яшчэ тлумачаць, што падаткі трэба плаціць добраахвотна

У апошнія гады падатковыя органы сканцэнтраваныя на кантролі за плацельшчыкамі, якія наўмысна парушаюць заканадаўства і выкарыстоўваюць схемы ўхілення ад выплаты падаткаў. Як заўважыў намеснік міністра па падатках і зборах Ігар Скрыннікаў, у гэтыя схемы трапляюць і ўтойванне выручкі, драбненне бізнесу, неабгрунтаванае вяртанне з бюджэту сум падатку на дабаўленую вартасць, а таксама выкарыстанне індывідуальных прадпрымальнікаў для падмены працоўных адносін.

У прыватнасці, увага таксама ўдзяляецца выплаце заработнай платы «ў канвертах». Падатковыя органы праводзяць тлумачальныя і прафілактычныя мерапрыемствы, даюць магчымасць даплаціць падаткі добраахвотна. Так, па выніках аналізу паказчыкаў дзейнасці прадпрыемстваў за 9 месяцаў бягучага года, у адрас амаль 24 тысяч суб'ектаў гаспадарання накіраваныя паведамленні ў рамках наступнага этапа камеральнага кантролю. Як вынік, сума добраахвотна выплачанага падаходнага падатку перавысіла 10,5 млн рублёў.

Але не ўсе разумеюць з першага разу. У дачыненні да тых суб'ектаў гаспадарання, якія працягваюць парушаць заканадаўства, прымяняюцца адпаведныя меры адказнасці. З улікам крытэрыяў ацэнкі ступені рызыкі і на падставе наяўнай інфармацыі за 9 месяцаў гэтага года падатковыя органы правялі каля 720 праверак, у выніку якіх толькі падаходнага падатку прад'яўлена да выплаты на суму звыш 5,5 млн рублёў.

За тых, хто жыве не па сродках, бяруцца грунтоўна

Асобна спыніўся намеснік міністра на тэме, калі людзі трацяць значна больш, чым зарабляюць. Такіх людзей правяраюць ужо сур'ёзна.

— Кантрольная работа па дэклараванні даходаў і маёмасці грамадзян арыентавана на тыя катэгорыі, якія маюць высокія рызыкі ўтойвання прыбытку. Гэта кіраўнікі, заснавальнікі, работнікі арганізацый з нізкай заработнай платай і іншыя суб'екты. Кантроль ажыццяўляецца на падставе дэкларацый аб даходах і маёмасці, якія патрабуюць у фізічных асоб. Калі яны не могуць растлумачыць легальнасць паходжання крыніц даходаў, якія былі накіраваныя на набыццё маёмасці і іншыя асабістыя патрэбы, то сума перавышэння выдаткаў над даходамі абкладаецца падаходным падаткам па стаўцы 16 %, — растлумачыў механізм Ігар Скрыннікаў. — За 9 месяцаў гэтага года падатковымі органамі праведзены аналіз даходаў і выдаткаў маёмаснага становішча больш за 14,5 тысячы фізічных асоб. Паводле вынікаў, у 5,5 тысячы грамадзян, чые выдаткі значна перавышалі атрыманыя даходы, запатрабаваныя дэкларацыі аб даходах. Па выніках праверак больш за 1,8 тысячы чалавек не змаглі пацвердзіць легальнасць паходжання даходаў, у сувязі з чым ім прад'яўлена да выплаты 6,2 млн рублёў.

Ён таксама адзначыў, што падатковыя органы валодаюць істотнымі аб'ёмамі інфармацыі аб маёмасным становішчы фізічных асоб. Аналіз даных дазваляе рабіць выбаркі для вызначэння катэгорый грамадзян, якія падлягаюць кантролю ў першачарговым парадку.

Пенсію трэба сапраўды зарабіць

У нашай краіне ўсе суб'екты гаспадарання за сваіх работнікаў плацяць абавязковыя страхавыя ўзносы. Такім чынам работадаўцы фінансуюць выплату пенсій і дапамог. Намеснік кіраўніка Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Кацярына Ліхачова нагадала: каб сёння атрымліваць працоўную пенсію паводле ўзросту, неабходна на працягу 18 гадоў плаціць узносы ў ФСАН. У 2025 годзе працягласць аплаты ўзносаў павялічыцца да 20 гадоў. Што атрымаюць тыя людзі, якія цяпер узносы не плацяць або адлічваюць мінімум? А сёння ў нашай краіне больш за 2,5 млн пенсіянераў.

Кацярына Ліхачова падлічыла, як выглядае рэальны ўрон для работніка, які мае па бухгалтэрыі мінімальную лічбу, а на рукі атрымлівае сярэднюю зарплату. Атрымліваецца так, што, выплачваючы зарплату «ў канвертах» нават часткова, кіраўнік фірмы ўціскае сваіх работнікаў у правах на атрыманне дапамог па часовай непрацаздольнасці, цяжарнасці і родах. Напрыклад, калі работадаўца па бухгалтэрыі выплачвае мінімальную зарплату, а астатняе — «у канверце», то супрацоўнік за два тыдні бальнічнага атрымае 140 рублёў. Калі ж яму афіцыйна плацілі б сярэднюю заработную плату па краіне, а не клалі частку ў канверт, то ён атрымаў бы 500 рублёў. Калі мы гаворым пра дапамогу па цяжарнасці і родах, то, калі зарплата (афіцыйна) выплачваецца ў мінімальным памеры, дапамога складае 1,5 тысячы рублёў, а калі з памеру сярэдняй заработнай платы па краіне, то гэта практычна 6 тысяч рублёў.

Невясёлыя наступствы ад заробкаў «у канвертах» даганяюць работнікаў праз гады. Узнікаюць сітуацыі, калі людзі, дасягнуўшы агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, прыходзяць для прызначэння пенсіі і тут аказваецца, што з-за наймальніка, які не плаціў у належным аб'ёме або наогул не выплачваў узносы, у іх не сфарміраваны страхавы стаж і яны не могуць атрымліваць працоўную пенсію. У такім выпадку грамадзянін можа разлічваць толькі на пенсію сацыяльную, права на якую надыходзіць у больш познім узросце, ды і сумы там зусім іншыя. Каб дамагчыся справядлівасці, можна звярнуцца ў суд, але працэс наўрад ці будзе хуткі.

Арганізацыі, якія наўмысна хаваюць рэальную зарплату на прадпрыемстве, тым самым аказваюць уплыў на ўсю сістэму эканамічнай бяспекі краіны. Бо памер пенсіі залежыць ад сярэдняй зарплаты па краіне. Калі прадпрыемствы перастануць хаваць рэальныя лічбы, то сярэдні заробак будзе вышэйшы і ў разліковых каэфіцыентах пенсія стане ўжо іншая, яна нязменна ўзрасце.

Сяргей КУРКАЧ.

Дзеля памяці

Духоўны подзвіг Барыса Цітовіча

Памёр вядомы мастак, стваральнік мемарыяла Першай сусветнай вайны



Гістарычная памяць захоўваецца дзякуючы людзям неабыякавым, якія здольныя ахвяраваць свае час, сілы, матэрыяльныя даброты дзеля яе аднаўлення. Менавіта такім чалавекам быў мастак Барыс Цітовіч. Лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», кавалер ордэна Францыска Скарыны, ён неаднойчы рабіўся героем «звяздоўскіх» публікацый. Бо пры ўсёй сваёй сціпласці быў чалавекам, які ўвесь час прыцягваў захопленую ўвагу сваімі справамі. Паўстагоддзя таму Барыс Цітовіч, вядомы кніжны мастак, і яго жонка, рэжысёр тэлебачання Валянціна, пакінулі тлумную сталіцу і перасяліліся ў вёску Заброддзе Вілейскага раёна. І за гэты час ператварылі мала каму вядомую вёсачку з паўтара дзясятка хат у культурны цэнтр, куды штогод прыязджаюць тысячы турыстаў.

А пачыналася так... Як распавядаў Барыс Цітовіч, аднойчы яны з Валянцінай збіралі ў лесе каля Заброддзя грыбы і заўважылі дзіўныя ўзгорачкі... Аказалася — гэта магілы воінаў, якія памерлі ў дывізіённым шпіталі 29-й пяхотнай дывізіі 2-й Рускай арміі падчас Першай сусветнай вайны... А пра тую вайну тады не прынята было нават згадваць... Між тым яе вялікія бітвы адбываліся на Беларусі, меліся свае героі, незаслужана забытыя...

Мастак і яго жонка вырашылі аднавіць забытыя могілкі. І гэта быў толькі першы крок. Сёння дзякуючы Барысу Цітовічу памятных знакаў у раёне дзясятку, у тым ліку Барыса-Глебская капліца на беразе ракі Нарачанкі, узведзеная па бласлаўленні Уладыкі Філарэта, — мастак ахвяраваў на яе ўзвядзенне сваю прэмію «За духоўнае адраджэнне».

Мне давялося пабываць у тых памятных мясцінах і пазнаёміцца з Барысам Цітовічам дзякуючы гісторыку і калекцыянеру Уладзіміру Ліхадзедаву, які здзейсніў з мастаком шмат сумесных праектаў. Мы пабывалі тады каля прыдарожнага помніка-крыжа, усталяванага ў памяць падзей 1812 года, і каля кургана з вялізным белым крыжом на магіле салдат, што загінулі ў Першую сусветную, — на крыжы Барыс Цітовіч зрабіў выяву Спаса Нерукатворнага, які прысутнічаў на вайсковых штандарах. Наведалі і музей Першай сусветнай вайны, зладжаны ў капліцы ў вёсцы Заброддзе. На маё здзіўленне, як фактычна адзін чалавек мог столькі зрабіць, Барыс Цітовіч з усмешкай адказаў: «Выпала мне такое паслушэнства, што зробіш». Не ўсё было лёгка — любы энтузіязм сустракае як спыянне, так і неразуменне. Але ў Барыса Барысавіча было шмат аднадумцаў і сяброў. У садзе Перамогі ў Заброддзі, закладзеным у 1984-м у памяць пра загінулых у часы Вялікай Айчыннай вайны сваякоў, ёсць дрэвы, пасаджаныя Васілём Быкавым і Алесем Адамовічам.

Карацей, не дзіва, што ў гэтыя мясціны прыязджаюць не толькі з усіх куткоў Беларусі, але і з блізкага і далёкага замежжа. А яшчэ вельмі важна, што Барыс Цітовіч на справе паказваў, як трэба займацца патрыятычным выхаваннем: не фармальна, не для птушачкі, а жывой работай з моладдзю. З яго ініцыятывы адбываліся рэканструкцыі баёў, аўтапрабегі, квэсты, пленэры, фестывалі... І ў сваёй сям'і Барыс Цітовіч вырасціў аднадумцаў, якія будуць працягваць яго справу.

Паралельна з грамадскай дзейнасцю Барыс Цітовіч займаўся мастакоўскай працай. У яго афармленні выйшлі творы Шамякіна, Мележа, Быкава, Адамовіча, Броўкі. Многіх класікаў Цітовіч ведаў асабіста. Нядзіўна і тое, чаму мастака так кранала тэма вайны. Згадаць хаця б яго ўражлівую работу — графічную серыю «З альбома бацькі», створаную па ўспамінах бацькі мастака, які ваяваў на Курскай дузе, вызваляў Варшаву і Прагу, браў Берлін. Як тлумачыў аўтар, яго работы — «тое, што заклікана ўплываць на вашы сэрцы, даць вам магчымасць зразумець, чаму не павінна быць вайны».

Невыпадкова і тое, што Барыс Цітовіч быў яшчэ і іканапісцам.

У кожнай асобы ў гісторыі рана ці позна з'яўляюцца дзве даты, аб'яднаныя рысачкай... З'явілася другая дата і ў звестках пра мастака Барыса Цітовіча: ён памёр 20 кастрычніка 2021 года. Давайце ўспомнім словам удзячнасці гэтага светлага чалавека, які назаўсёды зойме месца ў пантэоне рупліўцаў беларускай гісторыі.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Даўгале Ірыне Віктараўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Калектыў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь выказвае спачуванне ў сувязі са смерцю ХВАШЧЭЎСКАГА Генадзя Іванавіча.

Доўгія гады Генадзь Іванавіч прысвяціў рабоце ў апараце Міністэрства гандлю. Узначальваючы ўпраўленне матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, а пазней упраўленне новых тэхналогій, інвестыцый і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, для маладога пакалення ён быў дастойным прыкладам прафесіяналізму і мэтанакіраванасці, узорам прынцыповага і мудрага кіраўніка.

ЦЭНТР ПРЫЦЯГНЕННЯ І МЕСЦА СІЛЫ

Якое шчасце патэлефанаваць у невялічкую вёску, якая размясцілася на мяжы Лідскага і Шчучынскага раёнаў, і пачуць голас сваёй старэнькай бабулі. Яна заўсёды спытаецца, як справы (дома і на рабоце), як расце мой сынок, яе праўнук, раскажа пра сябе. І ніколі не паскардзіцца на здароўе (хоць ёй пайшоў ужо 89-ты год), не скажа, што ёй нечага не хапае або штосьці не задавальняе. «Лепш за ўсіх», — заўсёды аптымістычна адказвае на пытанне «Як справы?» бабуля Тэня.

Праўда, найлепшымі яе справы мала калі былі. Колькі памятаю, бацькава маці заўсёды хадзіла з дапамогай кіёчкаў. Хворыя ногі ў яе былі з маладосці. У свой час на аперацыю на суставах не пагадзілася, потым было позна — узрост. Добра, што з мужам пашанцавала. Мой дзед быў вельмі клапатлівым гаспадаром, меў, як кажуць, і хлеб, і да хлеба. Але дзеля гэтага дзед Іван працаваў з ранку да вечара. А тут яшчэ і жаночая работа клалася на яго плечы: карову даіў ён, грады палоў сам, нават у ягады хадзіў...

А, між іншым, бабуля Тэня ў свой час не хацела выходзіць за яго замуж. Па-першае, дзядуля быў нашмат старэйшы за яе, па-другое, звычайны селянін — нічога асаблівага, як цяпер любіць казаць моладзь. Аднак тады моцна не пыталіся: бацька нявесты даў згоду, а гэтага было дастаткова. І не прагадаў: жылі душа ў душу. Нажылі траіх дзяцей, дапамагалі гадаваць унукаў, дачакаліся праўнукаў.

Вось ужо 11-ты гадок мінуў, як дзеда Івана не стала. Пайшоў на той свет ціха, раптоўна — такой смерці заслугоўваюць толькі шчаслівыя людзі. З дзедавым сыходам наша вялікая сям'я страціла нешта вельмі важнае.

Гора моцна падкасіла бабулю. Страціўшы сваю другую палавінку, яна асунулася, на яе добрым твары з таго часу рэдка калі з'яўлялася ўсмешка. Неўзабаве і свае кіёчкі змяніла на каляску: упала, таму хадзіць стала яшчэ цяжэй. Бабулю Тэню не маглі пакінуць адну — з горада ў вёску да яе перабралася старэйшая дачка. Зімуюць, наадварот, у цётчынай гарадской кватэры. Адразу бабуля вельмі сумавала, а сёлета ўвогуле ўсіх здзівіла: «Не хачу вяртацца ў вёску і ўсё!» Угаварылі, прыехалі — дома, як кажуць, і сцены грэюць. Неўзабаве будуць зноў на зімоўку збірацца. І кожны раз ёй, маёй кволай бабулечцы, думаецца: ці вернецца яна ў сваю хатку, ці пабачыць зноў свой вялікі каштан, які калісьці пасадзіў яе «паважаны» (менавіта так яна часцяком называла дзеда Івана).

Апошнім часам яна пачала забывацца: перапытвае па некалькі разоў адно і тое ж, не згадае нават таго, што ела на сняданак або з кім пяць хвілін таму размаўляла па тэлефоне. Але яна не паказвае выгляду, што яе гэта моцна турбуе: мінулае помніць выдатна, што рэгулярна пацвярджае падчас сваіх аповедаў.

Мы ўсе вельмі клапоцімся аб нашай бабулі. Асабліва дочкі, якія робяць усё дзеля таго, каб ёй было добра. Мой бацька, які ад роднай вёскі жыве ўсяго за тры кіламетры, пры любой магчымасці едзе да мамы. У яе на падворку любяць адпачываць унукі і праўнукі, а ў халодныя вечары дзівосная асалода — прытуліцца плячамі да печы і слухаць бабчыны аповеды. Усе разумеюць: цэнтр прыцягнення нашай сям'і — гэта яна, месца сілы — яе заўсёды ўтульная і цёплая хата. Сюды спяшаешся ў любую вольную гадзіну. Але так было да пандэміі. Цяпер застаецца толькі тэлефанаваць. І такое шчасце, калі на тым канцы провада чуеш яе спакойны ціхі голас, які заўсёды спытае: «Веранічка, як справы?»...

Вераніка КАНЮТА.

Сямейная газета

Выпуск № 19 (178)

Тыя, хто побач

Журналіст Тамара ВЯЦКАЯ:

«Жыць без кахання — гэта нядобра»

Тамара Вяцкая — вядомы беларускі радыёжурналіст, аўтар сцэнарыяў і цудоўных, з добрым гумарам кніг. Удумлівая і адначасова лёгкая, дакопваецца да сутнасці, добразычлівая да суразмоўцы, яна захапляе як калега. Заўсёды ў добрым настроі, са стыльнай стрыжкай і ў элегантных уборах, Тамара Вяцкая — прыклад для пераймання.

— Сёння ваша сям'я — гэта...

— Гэта мама Вера Мікалаеўна, ёй 86 гадоў. Мы жывём з ёй удваіх у кватэры, яна пераехала з Украіны вось ужо як тры гады. А яшчэ дзве дачкі і сын, два зяці, дзве нявесткі і дзесяць унукаў. І любімы брат Алег, ён з сям'ёй жыве ў Жодзіне. Шмат, так. Калі хаця б палова ў нас у гасцях — гэта крута. І так бывае часта.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Бацькоўскі клуб

ШЛЯХ У ПРАФЕСІЮ,

або Патрабуюцца спецыялісты з высокім эмацыянальным інтэлектам

Словы «дадатковая адукацыя» бацькі часта ўспрымаюць як «неабавязковая». Насамрэч педагогі, якія працуюць па-за школьнай праграмай, могуць даць сучасным дзецям тыя навыкі і ўменні, без якіх ім не абысціся ў далейшым жыцці. У сярэдняй навучальнай установе выкладаецца ўсяго каля двух дзясяткаў прадмета ў, а прафесій існуе больш за 40 тысяч! Да таго ж прафесійны свет імкліва змяняецца — адны спецыяльнасці знікаюць, іншыя з'яўляюцца. З кожным годам мы даведваемся пра тавары і паслугі, пра якія раней не чулі. Давайце паспрабуем зазірнуць у будучыню нашых дзяцей і высветліць, што можна зрабіць, каб яны ў яе «ўпісаліся».

Навыкі будучыні

У 2020 годзе на Сусветным эканамічным форуме былі агучаны перспектыўныя прафесійныя напрамкі. Вялікі попыт прагназуецца на спецыялістаў, якія ўмеюць апрацоўваць масівы даных, карыстацца інфармацыйнымі тэхналогіямі. Спатрэбяцца новыя інжынеры і распрацоўшчыкі, якія здольныя спалучаць веды з розных галін. Запатрабаванымі будуць кірункі, звязаныя са зносінамі людзей, вытворчасцю кантэнту. Пераход многіх галін у «анлайн» выклікае большы попыт на эмацыянальную сферу, культуру. Старэнне насельніцтва прывядзе да запыту на сацыяльны догляд. А таксама чалавецтва павінна рыхтаваць кадры для «зялёнай» эканомікі.

Спецыялістам будучыні трэба навучыцца выжываць ва ўмовах нявызначанасці, гібка перастройвацца пад змены, напрыклад, пад тое, што інфармацыя ўстарэла ці яе стала ў некалькі разоў больш. Яны павінны быць гатовыя да таго, што вучыцца і ўдасканальвацца давядзецца на працягу ўсяго жыцця.

Усё часцей узнімаецца пытанне аб неабходнасці развіцця ў дзяцей эмацыянальнага інтэлекту, і за мяжой гэта ўлічваецца пры распрацоўцы адукацыйных праграм для навучальных устаноў. Сапраўды, уменне разбірацца са сваімі і чужымі эмоцыямі дапаможа наладжваць кантакты, больш эфектыўна працаваць у камандзе, быць стрэсаўстойлівымі, умець пераконваць іншых (каб прадаць свае ідэі і тавары). Да таго ж у новым свеце з яго імклівымі зменамі і рытмамі важна ўмець канцэнтравацца, планаваць і размяркоўваць нагрузку, пралічваць стратэгію на некалькі крокаў наперад. І не трэба думаць, што ў нас гэтаму раней не вучылі. Хіба гульня ў шахматы не фарміруе такія здольнасці? А спартыўныя гурткі? А тэхнічная творчасць? Трэба проста не забывацца пра гэтыя рэсурсы, тым больш што адукацыйныя праграмы ў гуртках адаптуюцца пад патрабаванні часу, штогод запускаюцца новыя, дзеці працуюць з сучаснымі матэрыяламі і інструментамі. З дзецьмі займаюцца ў тым ліку і педагогі вышэйшай катэгорыі, выкладчыкі з ВНУ і Акадэміі навук.

(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)

Прававая гасцёўня

МАЦЯРЫНСКІ КАПІТАЛ ДАТЭРМІНОВА

На што і калі яго можна патраціць цяпер і ў 2022-м

Указам Прэзідэнта ад 18 верасня 2019 г. № 345 «Аб сямейным капітале» былі зменены некаторыя аспекты, звязаныя з гэтым відам дзяржаўнай падтрымкі. Цяпер грошы можна ўжыць датэрмінова (не чакаючы 18-годдзя дзіцяці) на паляпшэнне жыллёвых умоў, аплату вышэйшай адукацыі, медыцынскіх паслуг. Наступныя змяненні ў заканадаўства аб сямейным капітале, прадугледжаныя Указам Прэзідэнта № 389 ад 12 кастрычніка 2021 года, увойдуць у сілу 1 студзеня 2022 года. На што можна прымяніць мацярынскі капітал цяпер і налета, паведаміла, адказваючы на звароты шматдзетных маці, адвакат Мінскай калегіі адвакатаў Алёна ШМАНАЙ.

Заўчасна пагасіць крэдыт нельга

Дзесяць гадоў таму я, мая маці і мой сын пабудавалі кватэру з ільготным 5-працэнтным крэдытам як асобы, якія стаялі ў чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні ўмоў пражывання. Пазней я другі раз выйшла замуж і нарадзіла дзвюх дачок. Мы сталі шматдзетнай сям'ёй з дзіцем-інвалідам. Аднак у датэрміновым пагашэнні крэдыту нам адмовілі, паколькі першапачаткова чарга была маміна, а пазней, ужо пры крэдытаванні, усё аформілі на мяне: і кватэру, і крэдыт. Цяпер выйшлі папраўкі да магчымасцяў карыстацца сямейным капіталам. Ці падыходзіць наш выпадак пад датэрміновае выкарыстанне гэтых грошай?

Ганна Ч., *г. Віцебск.*

— Сапраўды, за кошт сямейнага капіталу свае жыллёвыя ўмовы могуць палепшыць сем'і, якія стаяць у чарзе асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў (ч. 2 п. 28, Палажэнне аб назначэнні і выкарыстанні сямейнага капіталу № 128). Аднак у вашым звароце гаворка ідзе, хутчэй за ўсё, аб новых змяненнях у заканадаўства аб сямейным капітале, якія ўвойдуць у сілу толькі 1 студзеня 2022 года.

Новыя змяненні дазволяць датэрмінова выкарыстоўваць сродкі сямейнага капіталу на паляпшэнне жыллёвых умоў наступным чынам. Шляхам набыцця долі жылога памяшкання, у выніку чаго шматдзетная сям'я становіцца ўласнікам усяго жылога памяшкання. Можна будзе таксама пагашаць пазыку, якая прадастаўляецца арганізацыямі па месцы работы члена сям'і на будаўніцтва або набыццё жылля. Стане магчымае і пакрыццё запазычанасці па крэдытах, якія прадастаўляліся банкам па дагаворы пераводу доўгу (прыёму запазычанасці).

Аднак на Указе № 389, які дзейнічае цяпер, няма новаўвядзенняў, якія датычацца паляпшэння жыллёвых умоў шматдзетных сем'яў за кошт сямейнага капіталу і звязаныя ў тым ліку з прызнаннем чарговасці іншых асоб для датэрміновага выкарыстання гэтага віду дзяржпадтрымкі.

Сёння датэрмінова патраціць сямейны капітал на паляпшэнне жыллёвых умоў можна так. За кошт сродкаў сямейнага капіталу грамадзяне могуць пабудаваць або рэканструяваць жыллё ў складзе арганізацыі забудоўшчыкаў або на падставе дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва. Яшчэ можна датэрмінова ўжыць мацярынскі капітал на будаўніцтва ці рэканструкцыю дома або кватэры ў блакіраваным жылым доме падрадным ці гаспадарчым спосабам, а таксама купіць дом ці кватэру, у тым ліку збудаваныя па дзяржзаказе. Акрамя таго, можна пакрыць грашыма мацярынскага капіталу запазычанасць па крэдыце на будаўніцтва, рэканструкцыю або пакупку жылля і выплаціць працэнты па такім крэдыце. Але не датэрмінова.

На газіфікацыю — нельга, на артапедыю — можна

Мы падавалі дакументы на пашырэнне і частку грошай з сямейнага капіталу выкарысталі на будаўніцтва кватэры, аднак зрабіць рамонт нам у гэтым жыллі за сродкі мацярынскага капіталу не дазволілі. Ці можам мы скарыстацца рэштай мацярынскага капіталу для правядзення газавага ацяплення і на што ўвогуле яшчэ можна ўжыць гэтыя грошы?

Адэля В., *Брэсцкая вобл.*

— Заканадаўствам краіны сёння прадугледжаны наступныя сферы, у якіх датэрмінова (незалежна ад даты прызначэння) можна патраціць увесь сямейны капітал або частку сумы.

Паляпшэнне жыллёвых умоў (гэтыя магчымасці апісаны ў папярэднім адказе).

Аплата сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі I ступені члена сям'і. За кошт сямейнага капіталу аплаціць можна вучобу толькі ў дзяржаўных навучальных установах.

Аплата медыцынскіх паслуг, калі ў іх мае патрэбу хтосьці з членаў сям'і. Грошы прадастаўляюцца на лекі і медыцынскія вырабы пры правядзенні складаных і высокатэхналагічных аперацый у кардыяхірургіі, нейрахірургіі і анкалогіі. Стаматалагічныя паслугі, якія можна атрымаць за сродкі мацярынскага капіталу: пратэзаванне зубоў, дэнтальная імплантацыя з наступным пратэзаваннем, артадантычная карэкцыя прыкусу.

Разам з тым, новыя змяненні ў заканадаўства аб сямейным капітале, якія ўвойдуць у сілу з 1 студзеня 2022 года, прадугледжваюць **дадатковыя напрамкі, на якія можна накіраваць сродкі сямейнага капіталу.**

Некаторыя аспекты датычацца паляпшэння жыллёвых умоў (прыведзены ў адказе на папярэдняе пытанне). Крыху зменяцца і ўмовы па атрыманні адукацыі. З 1 студзеня 2022-га можна будзе аплаціць вучобу ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі спажывецкай кааперацыі і ўстановах вышэйшай адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (напрыклад, у Міжнародным універсітэце «МІТСО»). А дадатковым напрамкам у выкарыстанні сямейнага капіталу на медыцынскія патрэбы стане выдзяленне медыцынскіх вырабаў для выканання складаных і высокатэхналагічных умяшальніцтваў у артапедыі. Можна будзе таксама набыць інвалідам, дзецям-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў з парушэннямі органаў зроку, апорна-рухальнага апарату тавары, прызначаныя для сацыяльнай рэабілітацыі і інтэграцыі ў грамадства.

ІНШАЗЕМНЫ ЭЛЕМЕНТ У АЙЧЫННЫМ ШЛЮБЕ

Што трэба ведаць беларусам пры стварэнні інтэрнацыянальнай сям'і

Беларусы могуць пабрацца шлюбам з суграмадзянамі, замежнікамі і нават асобамі без грамадзянства як у сваёй краіне, так і за яе межамі. Айчыннае заканадаўства не мае абмежаванняў на гэты кошт. Галоўнае, каб жаніх і нявеста былі вольныя (не мелі афіцыйных другіх шлюбаў), дзеяздольныя і не з'яўляліся блізкімі сваякамі. Летась, напрыклад, 7 % ад агульнай колькасці шлюбаў у Беларусі былі зарэгістраваныя з замежнікамі і асобамі без грамадзянства. Тым не менш, збіраючыся злучыць лёс з іншаземцам, акрамя вялікага кахання і жадання, трэба мець яшчэ ўяўленні аб сваіх правах і абавязках у інтэрнацыянальным шлюбе, тым больш калі ў такой сям'і яшчэ плануюцца дзеці. Пра некаторыя асаблівасці шлюбу з замежнікамі расказала Алена СЕМЯНЮК, кансультант упраўлення натарыята і ЗАГСаў Міністэрства юстыцыі.

РАСА, РЭЛІГІЯ, ГРАМАДЗЯНСТВА — НЕ ПЕРАШКОДА

Павелічэнне міграцыі насельніцтва, свабодны ўезд і выезд беларусаў за мяжу (без уліку пандэмічных абмежаванняў), развіццё асабістых і дзелавых кантактаў — усё гэта спрыяе ўзнікненню сямейных адносін з удзелам іншаземнага элемента, упэўнена спецыяліст:

— Беларусы маюць права ўступаць у шлюб без абмежаванняў па прыкмеце расавай ці рэлігійнай прыналежнасці. Пры гэтым важна памятаць, што шлюб — не простая фармальнасць, а важны юрыдычны факт. Заключэнне шлюбу, па-першае, спрыяе павышэнню пачуцця адказнасці адно перад адным і перад сям'ёй, якая ствараецца. Па-другое, рэгістрацыя шлюбу азначае прызнанне яго дзяржавай.

Кожная краіна самастойна вызначае парадак заключэння шлюбу з іншаземнымі грамадзянамі, які адлюстроўваецца ва ўнутраных заканадаўствах дзяржаў і абавязацельствах, якія прымае на сябе краіна пры заключэнні або далучэнні да міжнародных дагавораў. Згодна з артыкулам 11 Канстытуцыі Беларусі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства на тэрыторыі нашай краіны карыстаюцца тымі ж правамі і свабодамі, а таксама выконваюць тыя ж абавязацельствы, як і беларусы.

Тым не менш распаўсюджанасць сямейных адносін, якія ўскладнены іншаземным элементам, патрабуе надзейных гарантый правоў грамадзян у шлюбна-сямейных адносінах на тэрыторыі Беларусі, падкрэсліла Алена Семянюк:

— Артыкулам 228 Кодэкса аб шлюбе і сям'і прадугледжана, што іншаземныя грамадзяне і асобы без грамадзянства карыстаюцца ў Беларусі тымі ж правамі, як і беларусы, а таксама нясуць такія ж абавязацельствы. Форма і парадак заключэння шлюбу вызначаюцца заканадаўствам Беларусі незалежна ад грамадзянства асоб, якія жэняцца. Ва ўсіх выпадках шлюб павінен рэгістравацца органам ЗАГС, які абяруць маладыя.

Аднак замежны жаніх ці нявеста — не панацэя і не гарантыя доўгага і шчаслівага жыцця. Збіраючыся выйсці замуж за іншаземца або ажаніцца з іншаземкай, варта памятаць пра адрозненні менталітэтаў, заканадаўстваў краін і наяўнасць шлюбных аферыстаў, параіла спецыяліст:

— На жаль, нават калі шлюб бяруць па ўзаемным каханні, нярэдка ён заканчваецца разводам. А гэта заўжды доўгі і складаны юрыдычны працэс, звязаны з вырашэннем пытанняў падзелу маёмасці, выхавання дзяцей і вызначэння іх месцажыхарства. Таму, перш чым захапіўшыся каханнем, выскачыць замуж ці ў момант жаніцца, лепш пракансультавацца з адвакатам і высветліць акалічнасці сямейна-шлюбнага заканадаўства краіны, з грамадзянінам якой вы збіраецеся ўзаконіць адносіны ці ў якой збіраецеся жыць.

ЮРЫДЫЧНЫ, ГРАМАДЗЯНСКІ, ЦАРКОЎНЫ

Сучасная сям'я перажывае якасныя змены, звязаныя з глабальнымі сацыяльнымі працэсамі індустрыялізацыі і ўрбанізацыі, якія былі неўласцівыя традыцыйнаму грамадству. Сёння адбываецца трансфармацыя сям'і як сацыяльнага інстытута, змяняюцца некаторыя яе функцыі, пераразмяркоўваюцца сямейныя ролі.

— Сёння ўжо можна весці гаворку пра існаванне трох відаў шлюбу. Аднак варта памятаць, што шлюб, здзейснены па рэлігійных абрадах, а таксама фактычныя шлюбныя зносіны не прыводзяць да прававых наступстваў, — адзначыла прадстаўніца Мінюста.

Юрыдычны шлюб — саюз, мэта якога — стварэнне сям'і. Ён заключаецца з выкананнем пэўных правіл заканадаўства і выклікае ўзаемныя асабістыя і маёмасныя правы і абавязацельствы сужэнцаў.

Грамадзянскі шлюб — працяглае адкрытае сумеснае пражыванне мужчыны і жанчыны ў незарэгістраваным на законных падставах шлюбе, нават калі яны вядуць сумесную гаспадарку і выхоўваюць агульных дзяцей. Такі шлюб стварае толькі зносіны мацярынства і бацькоўства (калі апошняе прызнана добраахвотна ці праз суд). Такія адносіны маюць не паўнавартасны, а толькі пэўны набор правоў, напрыклад права дзіцяці наследаваць спадчыну абодвух бацькоў. Сужыцелі (юрыдычна называць іх сужэнцамі нельга) не могуць, згодна з законам, наследаваць маёмасць адно аднаго.

Царкоўны шлюб — шлюб, які не прыводзіць да юрыдычных наступстваў з пункту гледжання дзяржавы і рэгулюецца толькі нормамі ўнутрыцаркоўнага права.

ПЕРАКЛАДЧЫКА — МОЖНА, ПРАДСТАЎНІКА — НЕЛЬГА

Каб зарэгістраваць заключэнне шлюбу, трэба прадставіць у ЗАГС пэўныя дакументы: сумесную заяву аб рэгістрацыі заключэння шлюбу; пашпарты ці іншыя дакументы, якія сведчаць асобы заяўнікаў; дакумент, які пацвярджае аплату.

— У заяве аб рэгістрацыі заключэння шлюбу павінна быць пацверджана ўзаемная згода асоб, якія бяруцца шлюбам; дасягненне імі шлюбнага ўзросту; адсутнасць перашкод для заключэння шлюбу (прычыны немагчымасці заключэння шлюбу вызначаны ў Артыкуле 19 Кодэкса); указана, ці бралі жаніх і нявеста шлюб раней і ці ёсць у іх агульныя дзеці, — падкрэсліла Алена Семянюк.

Іншаземныя грамадзяне і асобы без грамадзянства (за выключэннем асоб, якія маюць статус бежанца або прыстанішча ў Беларусі) дадаткова павінны прадставіць наступныя афіцыйныя паперы: дакумент аб адсутнасці зарэгістраванага шлюбу з іншай асобай, выдадзены кампетэнтным органам дзяржавы пастаяннага пражывання іншаземца ці асобы без грамадзянства; дакумент аб адсутнасці зарэгістраванага шлюбу з іншай асобай, выдадзены кампетэнтным органам дзяржавы грамадзянскай прыналежнасці іншаземца (у выпадку, калі замежнік не пражывае на тэрыторыі дзяржавы грамадзянскай прыналежнасці); дакумент, які пацвярджае спыненне папярэдняга шлюбу (выдаецца кампетэнтным органам дзяржавы, на тэрыторыі якой шлюб быў скасаваны). У выключных выпадках могуць спатрэбіцца і іншыя дакументы.

— Калі іншаземец ці асоба без грамадзянства не валодае дзяржаўнымі мовамі Беларусі, рэгістрацыя акта грамадзянскага стану адбываецца ў прысутнасці перакладчыка, які пацвердзіў свой прафесійны ўзровень адпаведнымі дакументамі, — удакладніла спецыяліст. *— Калі асоба, якая бярэ шлюб, не можа з'явіцца ў ЗАГС для падачы сумеснай заявы з уважлівых прычын, то сапраўднасць яе подпісу на сумеснай заяве павінна быць засведчана ў парадку, вызначаным урадам Беларусі. Узаемная згода на шлюб заключаецца ў асабістай прысутнасці асоб, якія жэняцца. Рэгістраваць заключэнне шлюбу праз прадстаўніка забаронена. Калі жаніх ці нявеста ўталі абставіны, якія перашкаджалі заключэнню шлюбу, выкрыццё гэтага факта стане падставай для прызнання шлюбу несапраўдным.*

Матэрыялы паласы падрыхтавала Ірына СІДАРОК.

Шлюб рэгіструецца не раней чым праз тры дні і не пазней чым праз тры месяцы пасля звароту. У выключных выпадках (цяжарнасць, нараджэнне агульнага дзіцяці) шлюб можна заключыць хутчэй, нават у дзень звароту. Шлюбы паміж замежнымі грамадзянамі, а таксама паміж іншаземцамі і асобамі без грамадзянства заключаюцца ў Беларусі ў дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах замежных дзяржаў. Яны прызнаюцца сапраўднымі ў Беларусі пры ўмове, што асобы ў момант заключэння шлюбу з'яўляліся грамадзянамі дзяржавы, якая прызначыла пасла ці консула ў Беларусі. Калі хоць бы адзін з замежнікаў ці асоб без грамадзянства мае дазвол на пастаяннае пражыванне ў Беларусі, яны могуць пабрацца шлюбам у ЗАГСе нашай краіны.

«Жыць без кахання — гэта нядобра»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Усё яшчэ ходкае меркаванне, быццам сям'ю трэба захоўваць любой цаной, асабліва дзеля дзяцей. І вось што такое магло адбыцца, каб вы з трыма дзецьмі на руках вырашылі скасаваць шлюб?

— Проста скончылася каханне. Жыць без кахання, па маім устойлівым перакананні, — гэта нядобра. А чаму яно знікла, я казаць не буду, паразумеліся?

— У савецкі час статус разведзенай жанчыны не адбіўся на вашай кар'еры і на фінансавым дастатку?

— О не, наадварот. Я стала вольная для працы, дзеці толькі падтрымлівалі, яны заўсёды былі дастаткова самастойныя. А ўжо ў фінансавым плане таксама наадварот: стала больш працы і стала больш грошай, у мяне было чатыры аўтарскія праграмы на тыдзень і адна штодзённая на радыё, дзе я тады была палітычным аглядальнікам.

Мама і трое дзяцей.

таму што я такая шумная, лезу ва ўсе дзіркі, трымаю ўсё пад кантролем... Есці заўсёды я паспявала прыгатаваць, памыць-прыбраць таксама, вулічнымі яны ніколі не былі. Нянька была ў Ксеніі, ды і тое

Журавы, журавіны і Тамара.

толькі пару месяцаў, калі была маленькая. Бацькам часам адвозілі таксама.

— Як дзеці ўспрынялі развод?

— Дзеці мне заўсёды давяралі. Яны ні на дзень не спынялі зносіны з бацькам, і цяпер гэтак жа. Проста мы не сталі жыць разам, і ўсё.

— Ваша праца прадугледжвала і ненармаваны графік, і камандзіроўкі. Хто дапамагаў вам даглядаць дзяцей або яны з таго самастойнага пакалення, пра якое кажуць «выраслі з ключом на шыі»?

— Выдатная мая праца давала магчымасць дзесьці быць і з дзецьмі, і мы заўсёды былі на сувязі. Цяпер яны мне кажуць часам, што мяне ім не хапала. А я думаю, што мяне ім было нават і зашмат,

— Тамара Рыгораўна, дзеці раіліся з вамі, выбіраючы прафесіі ці спадарожнікаў жыцця?

— Мы з дзецьмі пастаянна пра ўсё гаварылі! Тады ж не было мабільных, і я ў тэлефоне не сядзела суткамі, як цяперашнія маладыя мамы. Мы ўвесь час размаўлялі. Але вось так выразна не магу зараз сказаць, ці паўплывала на выбар імі прафесіі. Але тое, што абедзве дачкі выдатна пішуць, — так, думаю, што генетычна перадалося *(смяецца)*.

— На многіх мерапрыемствах вы бываеце з дачкой Ксеніяй. Відаць, што вы яшчэ і сяброўкі. У чым сакрэт? Як атрымалася пабудаваць такія адносіны з дзецьмі?

— Пра тое, што мы з дочкамі сябры, не зусім згодная. Яны ведаюць дакладна межы: я маці, яны мае дочкі. Так, паўтару, я іх паўсюль брала з сабой, дзе можна было. І я іх вельмі люблю, гэта праўда. Цяпер, з вышыні пражытых гадоў, зразумела, што многае можна было б пабудаваць інакш, але — як атрымлівалася. Мы сям'я праваслаўная, можа, гэта і паўплывала на тое, што мы дружныя. У нас падтрымка і прыняцце адно аднаго, хоць часам яны спрабуюць неяк на мяне паўплываць у чымсьці, але я цяпер выдатна трымаю абарону сябе *(смяецца)*.

— Вы працягваеце працаваць пасля выхаду на пенсію. І, гледзячы на вас, я заўсёды разумею, што вы той чалавек, які ніколі не адмовіцца ад работы, спасылаючыся на ўзрост. Маўляў, мне ўжо не самавіта хадзіць на прэс-канферэнцыі ці не паеду ў камандзіроўку. А наколькі вы камфортна адчуваеце сябе ў статусе пенсіянеркі, якая працуе?

— Вось падышлі да нелюбімай тэмы. Не люблю гэты статус, і ён мне вельмі перашкаджае, вельмі. Не ўзрост, яго няма, а менавіта статус пенсіянеркі. Таму што сіл, вопыту, ведаў поўна, а ўжо не трэба... Так, працую і вельмі ўдзячная тым кіраўнікам, якіх гэты статус не бянтэжыць. Але перажыла двойчы адмову ў працы менавіта з-за ўзросту, гэта было вельмі хваравіта. Ёсць такая фраза, што маладыя былі ўсе, а старасць трэба заслужыць. Ну вось заслужыла, і што? Працаваць хачу і магу, цяпер нават да «Литературной газеты» дарасла, і там мае артыкулы друкуюць, гэта гонар мой. А ўзрост перашкаджае...

— Цяперашняе пакаленне пенсіянераў моцна адрозніваецца ад папярэдніх. Але ў нас чамусьці склаўся такі стэрэатып, што па-ранейшаму сфера інтарэсаў пенсіянераў — паліклініка, унукі, лецішча. Што сталыя людзі даношваюць адзенне, а элегантныя пенсіянеры — гэта не пра нашых. Рэальна сутыкалася з сітуацыяй, калі некаторыя індывіды ўслых дзівіліся, бачачы пажылых людзей на канцэртах з дарагімі кветкамі, або тых, якія ехалі на адпачынак за мяжу. Ці сутыкаліся вы з такім стаўленнем або пашанцавала з асяроддзем?

— Маё асяроддзе велізарнае, і сярод маіх людзей усё нармальна са стаўленнем. Мне рады, і ніхто не здзіўляецца. Вядома, у начныя клубы не хаджу, ды і ніколі не хадзіла, а вось у тэатрах і на выстаўках цяпер вельмі шмат маіх аднагодкаў. Мы жывыя, мы здаровыя і цікаўныя. Мы такія ж, як і былі, чаго ўжо хаваць *(смяецца)*. Мне камфортна ў любым грамадстве, і яшчэ раз дзякуй тым СМІ, дзе мяне прымаюць як журналіста. Дарэчы, я зараз і майстар-класы даю.

— Вы згодныя з меркаваннем, што старасць надыходзіць тады, калі чалавеку ўжо нічога не цікава і нічога не хочацца?

— Цалкам згодная! Хоць дзе яна — старасць? Вось мая матуля глядзіць навіны штодня, у храм ходзіць штодня... Так што старасці няма, ёсць немач па здароўі...

Частка вялікай сям'і.

— Наша агульная знаёмая, дарэчы, актыўная пенсіянерка, хатнія клопаты аддала на водкуп хатняй работніцы. А як вы спраўляецеся з бытам?

— Побыт выдатны. Мама вельмі дапамагае, гэта раз. А два — я люблю гатаваць і не люблю нудна харчавацца, таму штодня нешта новенькае. Вось сёння, напрыклад, кутабы з чорнай фасолю, тушаная капуста з рысам... А што яшчэ ў горадзе? Смешна. Падлогу памыць, вокны працерці, бялізнай пральная машына займаецца, ложак заправіць... Якія памочніцы?

— Тамара Рыгораўна, як вы распараджаецеся свайміфінансамі?

— О, фінансы... Любімая тэма. Паколькі ніколі не была багатай, то ўмею адчуваць сябе багатай заўсёды! Мая мама прывучыла: хай на стале пустая бульба, але будуць накрухмалены абрус і сталовыя прыборы. Умею гатаваць цікавыя стравы з простых прадуктаў і ўмею радавацца любым дробязям. Ёсць грошы — выдатна, няма — пайшла зарабляць!

— Дзе вы любіце праводзіць адпачынак? Што значаць у вашым жыцці падарожжы?

— Адпачываю заўсёды. Любімая работа — гэта ўжо адпачынак. Практычна не стамляюся. Калі вольная — чытаю. Мора люблю, Егіпет люблю, туды лётаю цяпер ужо раз на год, гэта па фінансах. Бяру кніг па колькасці дзён тура, і наперад. А падарожжа — мая радасць. А хоць у Смілавічы. Чаго і ўсім жадаю. І гэта проста, трэба паспрабаваць і захацець убачыць шмат новага. Проста хацець бачыць.

— Ваша кніга «Радасці і гадасці дарослага жыцця» мела вялікі поспех і ўжо бібліяграфічная рэдкасць. Калі чакаць працягу?

— Як, вы не ведаеце, што ёсць новая кніга — «Жыццё як нагода»? А яна ёсць! Проста пандэмія, не магу прэзентаваць так, як раней, шырока. І нават яшчэ не аддала яе ў «Белкнігу» на рэалізацыю, рукі не даходзяць. Я вам падару. Гэта вершы і проза і вельмі прыемныя водгукі тых, хто яе прачытаў... Так што пішу-пішу... Ведаеце, за доўгае жыццё шмат зроблена, шмат напісана. І не менш яшчэ наперадзе. Чаго і вам жадаю і ўсім чытачам «Звязды». Жыццё цудоўнае, гэта важна памятаць. І вучыцца бачыць навокал толькі добрае!

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота з асабістага архіва Тамары ВЯЦКАЙ.

Духоўны свет

БРЫДКАСЛОВЫ Ў ЦАРСТВА БОЖАЕ НЕ ЎВОЙДУЦЬ

Як ненарматыўная лексіка змяняе наша жыццё

Аб тым, наколькі нізкі ў нашы дні ўзровень культуры маўлення, сёння кажуць школьныя настаўнікі і выкладчыкі ВНУ, мовазнаўцы і дзеячы культуры. З мэтай павысіць экспрэсіўнасць выказвання да ненарматыўнай лексікі часам не саромеюцца звяртацца ні ў публічных выступленнях, ні ў сучаснай літаратуры, не кажучы ўжо пра блогі і пасты ў сацсетках. А некаторыя нашы сучаснікі літаральна размаўляюць з дапамогай мацернай лексікі — і гэта не маргіналы, а адукаваныя, часам паспяховыя людзі...

Але чаму брыдкаслоўе — зло? Чым яно небяспечнае з духоўнага пункту гледжання і як уплывае на наша жыццё? Пра гэта мы гутарым з **настаяцелем храма Свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску, айцом Аляксандрам ПАЛЬЧЭЎСКІМ.**

Ад лішку сэрца мовяць вусны

— Айцец Аляксандр, ці можна, на ваш погляд, лічыць брыдкаслоўе толькі праблемай культуры?

— Зразумела, гэта не толькі праблема культуры. Хоць не варта лічыць выкарыстанне ненарматыўнай лексікі прыкметай менавіта нашага часу. Гэтая лексіка прысутнічае ў жыцці грамадства на працягу многіх стагоддзяў. Проста сёння наша жыццё складваецца ва ўмовах актыўнага выкарыстання інфармацыйных тэхналогій, якіх не было раней. Сацыяльныя сеткі і месенджары спрасцілі зносіны, сам працэс зносін стаў больш шырокі, усёабдымны, і праблема брыдкаслоўя, што называецца, «выплыла на паверхню», стала відавочная. А ў цэлым царква звязвае гэтую праблему з духоўным станам людзей. Тое, што чалавек мае ў сваім сэрцы і думках, выходзіць праз яго вусны.

Можна сказаць, што ненарматыўная лексіка — усяго толькі спосаб выкладання думак. Але ж пра адно і тое ж можна казаць парознаму. І прычына выбару менавіта гэтых, брыдкіх, кепскіх слоў знаходзіцца ўнутры нас. Калі чалавек брыдкасловіць, лаецца, то спачатку з'яўляецца нейкае ўнутранае адчуванне, імпульс, які мы і выказваем, выбіраючы пэўныя словы. І калі словы кепскія, значыць, імпульс негатыўны.

— Але ж часам з дапамогай падобных слоў чалавек выказвае ў тым ліку станоўчыя эмоцыі. Напрыклад, захапленне...

— Так, але чаму ён не выбірае для выказвання станоўчых эмоцый словы ўзнёслыя, прыгожыя? Усё проста: таму што ў яго ёсць праблемы з унутраным жыццём, з адчуваннем гармоніі ўнутры свайго сэрца. Калі ў душы чалавека мір і гармонія, калі ён адчувае спакой і ўпэўненасць — наўрад ці ён будзе выбіраць падобныя словы. Апостал Іакаў кажа: з адной крыніцы не можа вылівацца і салодкая, і горкая вада (Іак. 3:11-12). Там, дзе ёсць адчуванне шчасця і падзякі жыццю, дзе прысутнічаюць малітва і благаславенне, наўрад ці ў любой сітуацыі знойдуць месца брыдкія словы. Брыдкаслоўе — праблема перш за ўсё духоўная. Гэта праблема адсутнасці або недахопу духоўнасці ў чалавеку, няведання і неразумення духоўных прынцыпаў жыцця. І таксама праблема самапавагі. Само гучанне — «брыдкаслоўе» — паказвае на гэта. Брыдкае — гэта тое, чым можна выпэцкацца. Прамаўляючы такія словы, чалавек прычыняе шкоду перш за ўсё сабе самому.

— Чым небяспечная ненарматыўная лексіка з духоўнага пункту гледжання? Чаму з дапамогай слоў можна прычыніць сабе шкоду?

— Напэўна, вы чулі выказванне: усе хваробы — ад нерваў. Сучасная медыцына пацвярджае: злосць, нянавісць, непражытая крыўда або страх будучыні, да якіх доўгі час вяртаюцца нашы думкі, наносяць здароўю велізарную шкоду, негатыўна адбіваюцца на рабоце органаў і сістэм нашага арганізма. А брыдкія словы, якія прамаўляюцца намі, — свайго роду «сімптомы» гэтай духоўнай неўладкаванасці. Яны і яе вынік, і ў значнай ступені прычына, паколькі пагаршаюць гэты негатыўны стан. Вось вам простая сувязь. Брыдкія словы нясуць у сабе дастаткова магутную сэнсавую і эмацыянальную нагрузку і таму адбіваюцца на фізічным і духоўным стане чалавека, які іх прамаўляе. Калі вы заўважылі, што шмат брыдкасловіце, значыць, прыйшоў час сур'ёзна задумацца пра сваё жыццё. Зразумець, чаму вы няшчасныя, што вы робіце не так, і пачаць з гэтым працаваць, каб у рэшце рэшт гэта выправіць.

Слова — адно з імёнаў Бога

— Брыдкаслоўе — гэта грэх?

— Так, вядома. Гэта далёка не бяскрыўдная слабасць. Брыдкія словы нясуць у сабе, як я ўжо казаў, вялікі зарад негатыўнай энергіі, што наносіць пэўную шкоду стану чалавека — фізіялагічнаму і псіхічнаму, не кажучы ўжо аб маральным і духоўным. Гэта яркая негатыўная эмоцыя, якая ўносіць разлад у душу самога брыдкаслова і навакольных людзей, што чуюць лаянку. Думаю, нікому не трэба даказваць: слова можа быць стваральным і разбуральным. У Бібліі сказана, што словам Гасподнім зацвердзіліся Нябёсы (Пс. 32:6). Ну, а брыдкаслоўе нясе ў сабе разбурэнне. Чалавек павінен імкнуцца быць бліжэй да Бога — у гэтым сэнс рэлігіі. І хрысціянства дае адчуванне прысутнасці Бога ў жыцці. А лаянкавыя словы знішчаюць гэтую прысутнасць. Брыдкімі словамі зневажаецца Божы Дух. Ёсць розныя меркаванні аб паходжанні мацерных слоў. Напрыклад, што яны бяруць пачатак у паганскіх культах, дзе людзі здзяйснялі паклянення ідалам. Можна сказаць, што з дапамогай мату мы ўпускаем у сваё жыццё цёмныя сілы. Мы звяртаемся да іх, калі гаворым гэтыя словы. А можна патлумачыць гэта інакш. З дапамогай лаянкі мы пакідаем у сваім жыцці злосць і зайздрасць, раздражненне і нянавісць, гнеў, а часам і лютасць замест таго, каб выгнаць іх са сваёй душы. Пагадзіцеся, такі ўнутраны стан аддаляе чалавека ад Бога і набліжае да процілеглага.

— Прынята лічыць, што справы важнейшыя за словы...

— Царква не падзяляе гэтыя паняцці — важна і тое, і іншае. У Евангеллі сказана: «Спачатку было слова, і слова было ў Бога, і слова было Бог...» (Ін. 1:1). Слова — адно з імёнаў Бога. Чалавек мае гэты Боскі дар: дар слова. Ужываць яго варта для стварэння свету. Ставіцца да слоў трэба менавіта так.

— Як словам можна стварацъ?

— Правільныя словы, сказаныя чалавеку ў хвіліну адчаю, гора, калі ён стаіць перад складаным выбарам, здольныя выратаваць. З дапамогай слоў можна падарыць або адабраць веру ў сябе, дапамагчы чалавеку (у тым ліку сабе самому) стаць моцным ці зрабіць яго (сябе) слабым. А наогул, стварэнне словам — гэта перш за ўсё малітва, духоўная рэальнасць, здольная мяняць навакольны свет. Калі мы звернемся да Бога і святых са шчырай малітвай, калі знойдзем правільныя словы і патрэбны ўнутраны настрой, рэальнасць здольная змяняцца. Чалавек атрымлівае вылячэнне або знаходзіць выхад, здавалася б, з бязвыхаднай сітуацыі. Словы падзякі маюць велізарную ўнутраную сілу. А дзякаваць заўсёды ёсць за што. Гасподзь заклікае нас адчуваць падзяку за смутак і за радасць. Калі мы дзякуем Богу, чалавеку, Сусвету за тое, што адбываецца ў нашым жыцці, свет вакол нас мяняецца да лепшага.

— Такім чынам, словы не нейтральныя — гэта наша сувязь з навакольным светам. Як брыдкаслоўе ўплывае на жыццё? Што сказаць падлетку, каб пераканаць яго не выкарыстоўваць ненарматыўную лексіку?

— Мы ўжо казалі аб тым, што лаянкавыя словы — вынік адсутнасці гармоніі з сабой і навакольным светам. І выкарыстанне кепскіх слоў пагаршае гэтыя праблемы. Мат, грубыя выразы — тое, што апаганьвае чалавека, пэцкае яго думкі і душу. І гэта распаўсюджваецца навокал. Як адвучыць падлетка брыдкасловіць? Перш за ўсё асабістым прыкладам. На жаль, сёння нярэдка дзеці становяцца сведкамі таго, як іх бацькі прамаўляюць лаянкавыя словы. Спытайце сябе, ці дазваляеце вы сабе брыдкасловіць? Больш за тое, ёсць ненарматыўная лексіка, а ёсць проста грубыя выразы, якія зневажаюць дзіця, руйнуюць яго самаацэнку. Выключыце іх з вашай штодзённасці. Усё гэта разбуральна ўплывае на наша жыццё, робіць нас больш няшчаснымі, засмечвае думкі і свядомасць.

Чаму не варта клясціся?

— У хрысціянстве існуюць забароны, звязаныя з пэўнымі словамі або выказваннямі. Раскажыце, калі ласка, пра іх. Чаму нельга прамаўляць клятву? Чаму не варта згадваць дарэмна Божае імя?

— Калі чалавек клянецца чымсьці, ён заклікае тое, што ад яго не залежыць, у пацвярджэнне свайго намеру. Але, як кажа Гасподзь, «...не кляніцеся зусім... Але да будзе слова вашае: так, так; не, не; а што звыш таго, тое ад лукавага» (Мф. 5:33-37). Хрысціянін павінен несці адказнасць за любое сваё слова, і таму ў яго не ўзнікае неабходнасці ў нейкіх дадатковых клятвах. Не варта клясціся Богам, дзецьмі або здароўем маці — чалавек не мае ўлады ў кіраванні тым, чым клянецца, усё гэта ва ўладзе Бога, а значыць, любая клятва — пустаслоўе.

Таксама не варта прамаўляць імя Божае дарэмна. Часам даводзіцца чуць, калі ў размове, паміж справай, для прыгожага слоўца або для звязкі паміж сказамі чалавек успамінае Бога. Але імя Божае павінна прамаўляцца з глыбокай павагай, з шанаваннем Бога як Творцы. А згадваць яго імя ў пустых, бессэнсоўных размовах недапушчальна.

— Як устрымацца ад брыдкаслоўя і супрацьстаяць спакусе выкарыстоўваць ненарматыўную лексіку?

— Проста усвядомце, што брыдкаслоўе наносіць шкоду вам і тым, хто чуе вашу лаянку. Калі чалавек не мае магчымасці выказаць свае думкі па-іншаму, гэта сведчыць аб яго нездольнасці запоўніць пустэчу ў душы прыдатным словам. Зразумеўшы, што наносім сабе шкоду, мы можам пераходзіць да наступнага этапу — выхоўваць звычку казаць іншыя, прыгожыя і правільныя словы. Бо наша жыццё — гэта тое, што мы пра яго думаем і гаворым. Калі мы ўспрымаем жыццё негатыўна і нават у радасці знаходзім негатыўныя словы, то такім наша жыццё і будзе. Нашы словы, думкі, дзеянні фарміруюць нас і тое, што нас акружае.

І яшчэ адна парада. Каб забыцца на зняважлівыя словы, пачніце менш сварыцца. Адна з найважнейшых запаведзяў хрысціянства — палюбі блізкага як самога сябе. Выходзячы з гэтага, мы павінны будаваць зносіны з навакольнымі — з членамі нашай сям'і, з калегамі, з суседзямі, са спадарожнікамі ў транспарце, у чарзе ў касу ў краме. Негатыўныя эмоцыі руйнуюць, паўтаруся, у першую чаргу нас саміх. Любоў жа стварае гарманічны свет перш за ўсё вакол таго, хто яе выпраменьвае.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ЯК СТАЦЬ ЧЭМПІЁНАМ СВЕТУ?

Георгій Выдзерка — пра шашкі, формулу поспеху і талісман

Яго гісторыя здзіўляе. Ёй самае месца на вялікім экране. Атрымаўся б добры фільм. Перамога за перамогай. За кадрам — цёплая сям'я. Георгій ВЫДЗЕРКА — чэмпіён свету па шашках-64 сярод моладзі. Паглядзець на поспех 13-гадовага юнака, які пачаў гучна перамагаць яшчэ ў дзевяцігадовым узросце, асабліва карысна. Што стаіць за яго чэмпіёнствам? Якая формула? І ці дапаможа яна іншым, калі пра яе расказаць? Акрамя самога героя, мы пагаварылі з яго мамай Святланай. І выйшлі на мегацікавыя сакрэты. Што можна зрабіць ужо сёння, каб заўтра ваша дзіця мела ўпэўненасць у сваіх сілах? Як выхаваць чалавека, які не спасуе перад гарою праблем? Ці можна накіраваць школьніка на поспех? Практычныя моманты, маленькія хітрыкі... Чытайце, укараняйце, дзяліцеся з іншымі бацькамі.

ГІСТОРЫЯ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА

Гродна. Мы сустрэліся з Георгіем у гарачы час падрыхтоўкі да наступнага турніру. За плячыма — новы тытул. Чэмпіён свету па шашках-64 сярод моладзі да 17 гадоў. Хлопец б'е ўсе магчымыя рэкорды. Стаў самым юным чэмпіёнам сярод мужчын па шашках-100 у гісторыі Беларусі. Здзівіў суддзю, абыграўшы вопытных шашыстаў. Нацыянальнае званне майстра спорту чакае, калі Георгію споўніцца 14.

У дашкольным узросце хлопчык ужо сапернічаў у шашках са сваім дзядулем. Актыўна займацца пачаў у восем гадоў пасля прагляду фільма «Гары Потэр і філасофскі камень». Натхнілі чароўныя шахматы: фігуркі паводзілі сябе як жывыя. І гэта гісторыя не пра магію, не пра цуд, не пра «хутка, лёгка, проста». Не пра «сеў за шашачную дошку — і адразу сказаў: «Маё!» Да майстэрства і поспеху вяла дарога, поўная перашкод. І ўнутраны дыялог не сціхаў.

«Дзіця сустрэне ў жыцці рознае, і людзі нагавораць яму балючага. Але ўнутраная апора гарантуе, што шчыт ніхто не праб'е».

На першых спаборніцтвах 8-гадовы Георгій прайграў адразу ўсе 16 гульняў. Але давёў турнір да канца. Не спыніўся нават пасля 15-га паражэння. Такую трэніроўку характару не кожны дарослы спартсмен вытрымае, а тут — дзіця, якое ўчора хадзіла ў садок. З нізоў турнірнай табліцы ўзляцець да зорак — тытанічныя высілкі.

— Людзям, што жывуць у рэальнасці, праходзяць свой неідэальны шлях, паражэнні, па сутнасці, патрэбны. Гэта неад'емная частка вопыту. Часам яны дапамагаюць стрымаць запал, калі пачынаеш задзіраць нос, — каментуе Георгій.

— Адчуваеш сваю вядомасць?

— Калі-нікалі так (*сціпла ўсміхаецца*). Здараюцца нават камічныя сітуацыі, апошняя — літаральна на днях, — дзеліцца юнак. — У школьнай сталовай работніца звярнулася: «Ты — той самы хлопчык, чэмпіён свету?! Глядзела сюжэт на тэлебачанні. Па кофце цябе пазнала». Да падобных момантаў з чужымі людзьмі падыходжу з пачуццём гумару. Проста смешна, і ўсё.

ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

— У 9 гадоў ты перамог на маладзёжным чэмпіянаце Еўропы. Якая яна, формула поспеху? Чаму не кожны заваёўвае медалі і кубкі?

— Трэба добра ведаць свае моцныя бакі, каб выбраць спорт правільна. Калі базавыя задаткі ёсць, то далей, як ні круці, застаецца толькі адно — развіваць якасці пераможцы. А гэта працавітасць, настойлівасць, — адказвае наш герой, а пасля дадае: — Важна падтрымліваць захапленне справай, а яшчэ не перагружаць сябе, бо хутка перагарыш. У шашках вядуць рэй добрая памяць, уседлівасць, кантроль над эмоцыямі. На турніры нельга выдаць настрой ні тварам, ні жэстам, ні рухам».

Амаль як у покеры. Шашкі — гульня інтэлектуальная. Славутая здольнасць шашыстаў будаваць у галаве лабірынты, пралічваць хады наперад — чыстая праўда. Георгій Выдзерка прызнаўся, што гэта рэальна — прадумаць партыю ад пачатку да канца. Але ж затратна па часе, таму нявыгадна. У класічнай доўгай праграме чэмпіён пралічвае наперад 8-9 хадоў, у рапідзе — 4-5, у бліцы — 2-3.

— А сваю будучыню можаш пралічыць? Кім бачыш сябе гадоў праз 10?

— Я вырашаю задачы тады, калі яны з'яўляюцца. Гэта лагічны прадукцыйны шлях. Не ведаю, што будзе заўтра. Як гаварыць пра 10 гадоў? — разважае герой. — Наконт прафесіі — архітэктар, можа, матаналітык. Бачу гэту сферу. Але яшчэ не адбылося той падзеі, якая б усё змяніла. А жыццё — не шашкі. Хто ведае?

«У шашках вядуць рэй добрая памяць, уседлівасць, кантроль над эмоцыямі. На турніры нельга выдаць настрой ні тварам, ні жэстам, ні рухам».

— У цябе столькі перамог! Здаецца, проста няма куды расці.

— Не, — адразу рэагуе Георгій. — Нават у дзесяцікратных чэмпіёнаў свету ёсць шлях далей. Можна развівацца ў гульні, распрацоўваць новыя варыянты. Можна заваёўваць тытулы. Я толькі чэмпіён свету сярод моладзі па рускіх шашках, хочацца — па шашках-100 і абавязкова сярод дарослых. Але гэта не жаданне, а мэта, як і стаць міжнародным гросмайстрам. Перамагчы на чэмпіянаце свету не адзін раз. Сёння рэкорд — 10, хочацца — 11. Ёсць пункты росту заўжды.

АДЗІНЫ СПОСАБ — ПЛАНАВАННЕ

Акрамя шашак, Георгій займаецца плаваннем, выяўленчым мастацтвам, фатаграфіяй, канструяваннем. У чэмпіёна таксама 24 гадзіны ў сутках. А прадукцыйнасць на зайздросным піку. Як так?

«Арганізацыя, рэжым», — упэўнены Георгій. Ён лічыць, што гэта залежыць ад сям'і. Калі ў юнака з'явіўся трэнер, нагрузка павялічылася. Мама Святлана дапамагала сыну чарціць графік у таблі-цах, весці практычна пагадзінныя дзённікі. Навошта? Каб сын не страчваў час. Шашкі, урокі, хобі і абавязкова — свабодныя гадзіны. Чалавек не робат. Без адпачынку ён перагарыць. Планаванне — адзіны спосаб мець рэзультат без праблем са здароўем.

Перад чэмпіянатам свету гэтым летам Георгій Выдзерка займаўся па 8 гадзін штодзень, цяпер — па 4—6, бо ўрокі самі сябе не зробяць, на іх таксама патрэбны час. Пасля турніраў можна даць сабе магчымасць «пабыць агароднінай», як жартуе чэмпіён.

Голас Георгія прыемны, упэўнены, і сам ён упэўнены. Эмацыянальна старэйшы за аднагодкаў. Думкі, аналіз, адкрытасць. Нядзіўна, што на спаборніцтвах ён адчувае сябе як рыба ў вадзе. Сярод яго аднадумцаў — дарослыя людзі. Кажа, што, нягледзячы на канкурэнцыю, камунікаваць з іншымі шашыстамі вельмі падабаецца. І адносіны па-за межамі партый з сапернікамі добрыя і цёплыя.

НАВОШТА ВЕСЦІ ДЗІЦЯ НА ШАШКІ?

Эмацыянальная дарасласць — гэта не адзіны бонус, які даюць заняткі шашкамі.

Ва ўсіх шашыстаў, шахматыстаў бліскучая памяць. Вучыць вершы? Раз прачытаў вечарам і яшчэ раз перад урокам — гатова. Тое самае — з любымі параграфамі. Яны аналітыкі. Адцісну-ць патрэбнае без вады — у імгненне вока. З матэматыкай, інфарматыкай — ніякіх праблем.

Пасля першых вялікіх спаборніцтваў у Георгія з'явілася шалёная матывацыя вучыць замежныя мовы. Галандцы, кітайцы, эстонцы, немцы — ніхто не гаворыць па-руску. А паразмаўляць так хочацца.

Турніры — цудоўная магчымасць убачыць свет. Разам з мамай Георгій Выдзерка пазнаёміўся са славутасцямі беларускіх гарадоў, а таксама Польшчы, Літвы, Нідэрландаў, Эстоніі, Ізраіля, Турцыі, Балгарыі, чэмпіянаты ж праводзяць у розных кутках планеты.

Класныя бонусы для дзіцяці, ці не так?

САКРЭТЫ ПАЗІТЫЎНАГА ВЫХАВАННЯ

Калі Святлана, мама Георгія, разважае пра формулу поспеху і псіхалагічнага спакою дзіцяці, у словах яе і колер, і гук. Шчырыя думкі маюць лячэбны сэнс. Ён натхняе іншых бацькоў.

— Адно слова — павага. Ніколі не ставілася да Георгія як да малога карапуза. І ў два гады ён ужо быў асоба, роўная мне. Адказвала на кожнае пытанне. Калі ён да мяне падыходзіў, я адкладвала ўсе справы, давала зразумець: «Ты для мяне важны». Дзеці з маленства адчуваюць бацькоўскую павагу. Паступова яна стане самапавагай. Дзіця сустрэне ў жыцці рознае, і людзі нагавораць яму балючага. Але ўнутраная апора гарантуе, што шчыт ніхто не праб'е. «Ты не зможаш! Там усе разумныя! Куды лезеш?» Ну, калі вы лічыце, што ваша дзіця не можа, то яно і не зможа. Бо думка — рухавік. Асабліва маміна», — кажа Святлана.

— Атрымліваецца, павага — галоўнае?

— Яшчэ вера, безагляднаяя, абсалютная. Ляжыць дзіця на падлозе, плача, перажывае парад няўдач — няважна. Сляпая вера — магутная зброя. Найлепшыя лекі. Пахіснешся, пачнеш сумнявацца ў сілах свайго дзіцяці — шчыт праб'ецца. І гэта шчыліна нагадае пра сябе ў самы адказны момант. На чэмпіянаце свету я назірала такія гісторыі. Былі паўналетнія хлопцы, таленавітыя. Але ў дзяцінстве іх веру прабілі, яна кульгае. Яны наверсе, але далёка не так, як маглі б. А ёсць дзеці менш таленавітыя, затое з верай у сябе. Ідуць як танкі. Вось дзе магія.

На першых спаборніцтвах 8-гадовы Георгій прайграў адразу ўсе 16 гульняў. Але давёў турнір да канца. Не спыніўся нават пасля 15-га паражэння. Такую трэніроўку характару не кожны дарослы спартсмен вытрымае.

— А якія практычныя моманты добра памятаць бацькам?

— Забыцца пра выразы: «Ты не такі, зрабіў не тое, трэба было быць лепшым». Так, мы не можам пастаянна хваліць. Але памятаць, што гэта ты зрабіў дрэнна, а не сам дрэнны, можам, — лічыць мама чэмпіёна. — І галоўнае. Ты зрабіў дрэнна — цябе пакаралі. Навошта? Проста выправі! І без ціску. Віна жудасна абразае крылы. Яна цягне за сабой пакаранне ад кагосьці ці ад самога сябе. Але ўсе маюць права на памылку. Гэта зноў пра павагу да сябе і іншых. А яшчэ дзіцяці добра адразу зразумець, што ўсё ў яго руках, спіхнуць на абставіны не атрымаецца. Ударыўся аб ножку стала — стол кепскі? Дробязь, якая выхоўвае негатыўную ўстаноўку. Шукаць апраўданне звонку — псіхалогія паражэння.

Успамінаю чэмпіянат Беларусі, на якім Георгій стаў самым маладым чэмпіёнам. Я тады сядзела ў калідоры, пісала планы. Галоўны суддзя гаворыць: «Георгій, пакажы мне свой талісман». Сын адчыняе дзверы да мяне, кажа: «Мама, тут пра талісман пытаюць». Суддзя: «Што там у цябе?» Не разумеюць яны: талісман сядзіць у калідоры і піша планы. Мы пра гэта маўчым, бо мяне перастануць пускаць на спаборніцтвы. Ужо спрабуюць. Але я пакуль яшчэ прарываюся (*усміхаецца*).

...Гэта маці здзіўляе мудрасцю, да якой хочацца дакрануцца. Няма і ніколі не будзе ў дзіцяці лепшага талісмана, чым яго любячыя бацькі.

Маргарыта САДОЎСКАЯ.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: комбайн зерноуборочный Лида – 1600 гос. № 2709 СВ-4 (заводской № 0101, 2010 г. в.). Начальная цена продажи лота – 48 179,27 руб. (сорок восемь тысяч сто семьдесят девять рублей двадцать семь копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 4 817 руб. (четыре тысячи восемьсот семнадцать рублей)

ЛОТ 2: комбайн зерноуборочный MEGA-208, гос. № 7491 СВ-4 (заводской № 94503124, 2002 г. в.). Начальная цена продажи лота – 81 187,44 руб. (восемьдесят одна тысяча сто восемьдесят семь рублей сорок четыре копейки) с учетом НДС.
Сумма задатка – 8 118 руб. (восемь тысяч сто восемнадцать рублей)

ЛОТ 3: свекловуборочный комбайн Kleine SF-10-2, гос № 0476 СВ-4 (заводской № 2310068, 2008). Начальная цена продажи лота – 113 453,47 руб. (сто тринадцать тысяч четыреста пятьдесят три рубля сорок семь копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 11 345 руб. (одиннадцать тысяч триста сорок пять рублей)

Условия проведения аукциона: аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон.
Срок заключения договора купли-продажи – 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Продавец – Коммунальное сельскохозяйственное унитарное предприятие «Гнезно», 231901, Волковысский р-н, д. Гнезно, ул. Зеленая, 8, тел. 8-01512-210-83

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Номер р/с для перечисления задатка BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 23 ноября 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).
Последний день приема заявлений – 19 ноября 2021 г. до 15.00

Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/

ООО «ИПМ-Консалт оценка» сообщает о проведении 05.11.2021 г. повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «ГрадСтройАльянс»

Предмет аукциона
Адрес: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Ровчакова, 12

Наименование (назначение), инвентарный номер, общ. площадь	Начальная цена (без НДС), бел. руб., снижена на 20 %	Шаг аукциона, бел. руб.
Административно-хозяйственное здание (здание административно-хозяйственное), инв. номер 700/С-90030, общ. площадь 286,4 кв. м	50 880,00	2 544,00

Составные части и принадлежности: двухэтажное каменное административно-хозяйственное здание.
Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,7689 га, предоставлен Продавцу на праве аренды для обслуживания зданий и сооружений (доля 173/7689)

Извещение о проведении повторных торгов опубликовано в ЕГРСоБ 21.10.2021 г.
Срок подачи заявок на участие в торгах: по 04.11.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка». Договор купли-продажи покупатель обязан подписать не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня завершения открытого аукциона. Срок оплаты предмета торгов: в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.
Подробная информация о порядке проведения аукциона размещена на сайтах www.bankrot.gov.by и ipmtorgi.by. УНП 790649039

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об открытом аукционе

ЛОТ 1: Ford Transit (легковой (вагон)), 2009 г. в., пробег 234762 км, гос. № 1157 ЕС-4, цвет – темно-синий, разрешенная максимальная масса – 3000 кг.
Начальная цена продажи лота – 22 920 руб. (двадцать две тысячи девятьсот двадцать рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 2 292 руб. (две тысячи двести девяносто два рубля)

Продавец – дочернее унитарное предприятие «Проектный институт Гродногипрозем» республиканского унитарного предприятия «Проектный институт Белгипрозем»

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона: возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по оказанию услуг по независимой оценке транспортного средства в размере 181,50 руб.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов. Условия оплаты – по договоренности сторон

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 22 ноября 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 18 ноября 2021 г. до 15.00

Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion

Извещение о проведении 10 ноября 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
